Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ЛІСТАПАДА 2008 г.
АЎТОРАК
№ 209 (26322)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

РАБОТА ПЛЮС «ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ»

Кантракты, рэжым працы і адпачынку, водпускі, іншыя нюансы працоўнага заканадаўства, а таксама ўсё, што датычыцца «кватэрнага пытання» і нерухомасці — пастаноўка ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў, дарэнне, завяшчанне, атрыманне ў спадчыну маёмасці і яе падзел. Аб усім гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» **з загадчыкам юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімірам Іванавічам ШЭЛКОВІЧАМ і намеснікам загадчыка юркансультацыі ФПБ Васілём Мікалаевічам КОРСУКАМ.**

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе **сёння з 11.00 да 12.30** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 21 і 292 38 92**.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСЬ МАЕ НАМЕР РАЗВІВАЦЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ЛІВІЯЙ

2 лістапада кіраўнік Вялікай лівійскай рэвалюцыі Муамар Кадафі прыбыў у Мінск з трохдзённым афіцыйным візітам. Гэта першы прыезд лівійскага лідара ў нашу краіну. Аляксандр Лукашэнка наведваў Лівію з афіцыйным візітам у 2000 годзе.

У Нацыянальным аэрапорце Мінск высокага госця сустрэў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У аэрапорце прысутнічалі таксама акрэдытаваныя ў Беларусі паслы арабскіх дзяржаў. Перад лідарамі дзвюх краін урачыстым маршам прайшла зводная рота ганаровай варты.

Пасля завяршэння цырымоніі афіцыйнай сустрэчы ў зале афіцыйных дэлегацый Нацыянальнага аэрапорта Мінск адбылася кароткая гутарка Прэзідэнта Беларусі і кіраўніка Вялікай лівійскай рэвалюцыі.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што ўсе дамоўленасці з Лівіяй васьмігадовай даўнасці застаюцца ў сіле. Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што ў Беларусі і Лівіі ёсць новыя магчымасці для развіцця двухбаковых адносінаў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з вялікім задавальненнем прымае сёння на беларускай зямлі Муамара Кадафі. «Вельмі добра памятаю нашу сустрэчу ў вас на радзіме. Вельмі рады таму, што адбываецца цяпер у вас у краіне. Лівія — краіна, якая інтэнсіўна развіваецца, і мы ўсяляк жадаем вашаму народу дабрабыту», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Учора Аляксандр Лукашэнка і Муамар Кадафі правялі перагаворы ў вузкім і пашыраным складзе.

Беларусь і Лівія маюць падобныя погляды адносна светаўладкавання. Гэты факт асабліва адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«Я ўдзячны вам за тое, што вы ў адказ на наш візіт прыбылі ў Беларусь. І мы маем сёння магчымасць абмеркаваць многія напрамкі нашага супрацоўніцтва. У Беларусі і Лівіі няма розных падыходаў да асноўных праблем светапарадку. Мы, таксама як і вы, прынцыповым пытанням лічым, што свет павінен быць шматпалярны, што гэта наогул прынцып існавання любой сістэмы: яна павінна абапірацца на многія пункты. Тады яна ўстойлівая», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі вельмі рады перамозе Муамара Кадафі на міжнароднай арэне. «Мы ведаем, як складана было выстаяць, вытрымаць міжнародныя санкцыі, абсалютна незаконна навязаныя вашай краіне. І пры гэтым вывесці краіну ў лік дзяржаў, якія сёння вызначаюць палітыку ў свеце», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Ён таксама дадаў, што Беларусі імпануе незалежная палітыка Лівіі ў ААН.

Фота БЕЛТА.

Беларусь, таксама як і Лівія, лічыць, што паміж дзяржавамі павінны быць раўнапраўныя адносіны, а рознагалоссі неабходна ўстараняць выключна палітычнымі метадамі, без прымянення насілля і двайных стандартаў, паведаміў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што Беларусь вітае пазіцыю Лівіі ў якасці непастаяннага члена Савета Бяспекі ААН, а таксама выказаў удзячнасць лівійскаму боку за пастаянную падтрымку пазіцыі Беларусі на міжнароднай арэне.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, беларуска-лівійскія сувязі традыцыйна будуюцца на аснове ўзаемнага даверу. «Беларусь на справе даказала сваю падтрымку Лівіі ў самыя цяжкія для лівійскага народа моманты. Наш народ і сёння гатовы аказваць неабходнае садзейнічанне ў далейшым развіцці вашай краіны», — сказаў беларускі лідар.

Нягледзячы на тое, што гандаль паміж Беларуссю і Лівіяй развіваецца нядрэнна, існуючы аб'ём не адлюстроўвае патэнцыял дзяржаў, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У студзені-жніўні 2008 года тавараабарот Беларусі і Лівіі склаў $19,1 млн, у асноўным за кошт паставак паўфабрыкатаў з вугляродзістай сталі, у нязначным аб'ёме экспартавалася сухое малако.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што закрытых тэмаў у супрацоўніцтве Беларусі з Лівіяй няма. Кіраўнік дзяржавы выказаў жаданне, каб лівійскі бок падтрымаў беларускіх спецыялістаў пры рабоце ў Лівіі. Ён таксама адзначыў, што «Беларусь будзе вітаць па любых напрамках лівійскі бізнэс і спецыялістаў». «Хацелася б, каб вынікам вашага візіту стала вырашэнне гэтых практычных пытанняў», — сказаў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Муамар Кадафі падзякаваў за цёплы прыём і гасціннасць, выказаў задавальненне ходам развіцця адносінаў паміж дзвюма краінамі. «Гэты візіт дасць большы штуршок у развіцці нашых адносінаў», — падкрэсліў лівійскі лідар. Ён таксама выказаў заклапочанасць тым, што з-за парушэння балансу ў свеце сталі парушацца ўсе міжнародныя нормы і вядзецца размова з пазіцыі «сіла — закон». «Мы хочам, каб на ўсёй планеце быў мір, каб больш не паўтарылася такая агрэсія, як Другая сусветная вайна», — сказаў кіраўнік Вялікай лівійскай рэвалюцыі.

Беларусь разглядае Лівію ў якасці блізкага сябра і партнёра, з якім гатова весці дыялог па любых пытаннях, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў надзею, што прыезд Муамара Кадафі ў Беларусь надасць новы магутны імпульс узаемавыгаднаму супрацоўніцтву па ўсіх напрамках.

На сустрэчы бакі абмяняюцца думкамі па самаму шырокаму колу пытанняў і намецяць асноўныя напрамкі ўзаемадзеяння.

Пасля перамоў у прысутнасці Аляксандра Лукашэнкі і Муамара Кадафі быў падпісаны шэраг дакументаў. У прыватнасці, заключаны Канвенцыя аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання, Пратакол аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам юстыцыі Беларусі і Галоўным народным камітэтам юстыцыі Вялікай Сацыялістычнай Народнай Лівійскай Арабскай Джамахірыі, Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Дзяржаўным камітэтам па стандартызацыі Беларусі і Нацыянальным цэнтрам па стандартызацыі і метралогіі Лівіі, Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Рэспублікі Беларусь і Генеральным бюро вяшчання Вялікай Сацыялістычнай Народнай Лівійскай Арабскай Джамахірыі.

Вечарам адбыўся афіцыйны прыём ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў гонар кіраўніка Вялікай лівійскай рэвалюцыі Муамара Кадафі.

Кіраўнік Вялікай лівійскай рэвалюцыі Муамар Кадафі наведаў Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У ВЫХАДНЫЯ ЎНАЧЫ ДА МІНУС 7

На працягу тыдня надвор'е ў нашай краіне будзе вызначацца моцнымі і часам даволі халоднымі антыцыклонамі, таму ў гэтыя дні пераважна без ападкаў, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Толькі ў сераду — чацвер праз нашу краіну будзе рухацца малаактыўны атмасферны фронт, які прынясе невялікія дажджы.

Сёння ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях пераважна сонечна, а на астатняй тэрыторыі краіны месцамі на працягу сутак туман. Тэмпература паветра ўдзень 3—9, у Брэсцкай вобласці да 11 цяпла. У сераду ў асобных раёнах чакаюцца невялікія дажджы, уначы і раніцай туман моцны. Тэмпература паветра ўначы плюс 1—8 градусаў, па ўсходзе да 0 — мінус 2 градусаў, удзень — 4—10 градусаў, па паўднёвым захадзе да 14 цяпла.

У чацвер тэмпература паветра на працягу сутак 2—8 цяпла, уначы па паўночным усходзе 0—2 марозу, удзень па Брэсцкай вобласці да плюс 10 градусаў. 7 лістапада да нас завітае даволі халодны Скандынаўскі антыцыклон. Ападкаў не будзе, але істотна пахаладае. Тэмпература паветра ў ноч на пятніцу 0 — мінус 6 градусаў, па паўднёвым захадзе 1—3 цяпла, удзень — 0—7 цяпла.

Чакаецца, што ў суботу і нядзелю ўначы стане яшчэ халадней — мінус 1—7 градусаў, па паўднёвым захадзе 0 — плюс 2 градусы, удзень у суботу 1—7 цяпла, у нядзелю — плюс 2—9 градусаў, пры гэтым будзе сонечна.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗЛОЎЖЫВАННЕ ПАЦЯГНУЛА НА 49 МЛН?..

Брэсцкай транспартнай пракуратурай узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да адказнай асобы чыгуначнай станцыі «Высока-Літоўск».

Паводле папярэдняй інфармацыі, 32-гадовы жыхар Камянецкага раёна падазраецца у тым, што сёлета з красавіка па верасень нанёс урон Брэсцкаму аддзяленню Беларускай чыгункі ў памеры 49 мільёнаў рублёў.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

ПАТАНУЛІ РЫБАКІ

Трагічнае здарэнне адбылося ў мінулую суботу ў Глыбоцкім раёне, дзе з вады не змаглі выбрацца двое.

28-гадовы жыхар вёскі Пятронава і 45-гадовы вясковец з Ласноўшчыны, абодва рабочыя прыватнага прадпрыемства, рыбачылі на возеры паблізу вёскі Надазер'е. Бяда ж здарылася каля а паловы пятай вечара, калі іх лодка перакулілася: на жаль, са сцюдзёнай вады іх выцягнулі ўжо нежывымі...

Ігар ГРЫШЫН.

КЕПСКІ ЗРОК — НЕ ПЕРАШКОДА ДЛЯ «МАБІЛЬНІКА»?

У Беларускім пратэзна-артапедычным адналенчым цэнтры завершана работа па распрацоўцы і вытворчасці інваліднай каляскі новага пакалення з электрапрывадам. Выпуск гэтых калясак мяркуецца наладзіць з пачатку наступнага года. Пры гэтым плануецца, што першыя дзесяць новых сродкаў перамяшчэння атрымаюць інваліды Вялікай Айчыннай вайны.

Як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка, адначасова распрацаваныя стандарты на выпуск некаторых іншых дапаможных сродкаў. У прыватнасці, гаворка ідзе аб рэгулюемых ложках для асобаў з фізічнымі недахопамі, спецыяльных мабільных тэлефонах для інвалідаў па зроку і слыху, святлафорах з гукавымі і адчувальнымі сігналамі для сляпых і слепаглухіх людзей.

Сяргей ГРЫБ.

Пятае чэмпіёнства БАТЭ

Фота Пятра ФАМІНА.

Барысаўскі БАТЭ датэрмінова аформіў чарговае чэмпіёнства ў нацыянальным першынстве. У матчы 17-га тура супраць жодзінскага «Тарпеда», які быў перанесены на 31 кастрычніка, барысаўчане святкавалі перамогу і першае чэмпіёнства, якое было аформлена на хатнім стадыёне. Папярэднія чэмпіёнствы 1999, 2002, 2006 і 2007 гадоў БАТЭ афармляў выключна на выездзе. Гэта трэці тытул запар і пяты ў гісторыі клуба. Разам з залатымі медалямі БАТЭ атрымлівае права дамаляваць да сваёй эмблемы залатую зорку, якая была пакуль толькі ў сталічнага «Дынама», які таксама пяць разоў станавіўся чэмпіёнам.

Перамогу барысаўчанам (2:1) прынеслі Віталь Радзівонаў, які распячатаў вароты сапернікa на 5-й хвіліне матча, і Генадзь Блізнюк, які вызначыўся праз дваццаць адну хвіліну. Абгуляўшы сапернікa, барысаўская каманда набрала 63 ачкі і стала недасягальнай для астатніх канкурэнтаў. Пры гэтым за два туры да фінішу ў БАТЭ ёсць яшчэ адна гульня ў запасе — перанесены матч з «Савітам».

Нягледзячы на тое, што галоўная задача сезона ў нацыянальным першынстве выканана, футбалісты не павінны пазбавіцца матывацыі ў астатніх гульнях чэмпіянату — пакуль ніводнага матча чэмпіён не прайграў. У актыве каманды 18 перамог і 9 нічыіх. Хутчэй за ўсё, БАТЭ нацэлены скончыць нацыянальныя спаборніцтвы без прайгрышаў. Усяго ж паражэнняў у чэмпіёна ў гэтым сезоне было толькі два — ад мадрыдскага «Рэала» (0:2) у матчы Лігі чэмпіёнаў і «Мінска» з другога дывізіёна, які разграміў БАТЭ ў 1/8 фіналу Кубка Беларусі (1:4).

Заўтра ў чацвёртым туры групавога этапа Лігі чэмпіёнаў барысаўскі клуб пазмагаецца з піцерскім «Зенітам». Нагадаем, што пасля першага круга лідзіруе ў групе Н турынскі «Ювентус», які заваяваў сем ачкоў, на другім месцы мадрыдскі «Рэал» з шасцю ачкамі, трэці БАТЭ (2), апошні «Зеніт» (1).

Больш за 4 тысячы балельшчыкаў «Зеніта» прыбудуць на матч з беларускай камандай. Стала вядома, што толькі ў Санкт-Пецярбургу прададзена 2,2 тысячы білетаў на матч, яшчэ 2 тысячы расійскія балельшчыкі набылі па сваіх каналах у Беларусі. Каля сотні фанатаў ужо прыехалі ў Мінск. Асноўная ж іх частка прыбудзе 5 лістапада спецыяльным цягніком, суправаджаць які будуць 15 супрацоўнікаў АМАПа Санкт-Пецярбурга.

Усім балельшчыкам супрацоўнікі ГУУС Мінгарвыканкама ў чарговы раз нагадваюць, што знешні агляд з прымяненнем металадэтэктараў будзе праводзіцца падчас пропуску на стадыён. Сачыць за сітуацыяй плануецца з дапамогай стацыянарных камер відэаназірання, супрацоўнікі міліцыі таксама маюць намер весці відэаздымкі. Допуск на стадыён пачнецца за 2,5 гадзіны да пачатку матча.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Гранічныя адпускныя цэны на хлеб да канца года будуць павялічвацца штомесяц на 2 працэнты

У Беларусі гранічныя адпускныя цэны на хлеб і хлебабулачныя вырабы да канца года будуць павялічвацца штомесяц на 2 працэнты, на малако, кефір, смятану, тварог — на 2,5 працэнта. Такое рашэнне змешчана ў пастанове Міністэрства эканомікі № 119. Павелічэнне гранічных адпускных цэнаў ініцыявана Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання.

Акрамя таго, гранічныя адпускныя цэны на ялавічыну, свініну тушамі ў кастрычніку былі павялічаны на 5 працэнтаў, у лістападзе будуць павялічаны на 4 працэнты.

«Павелічэнне фарміруемых арганізацыямі-вытворцамі адпускных цэнаў на канкрэтныя назвы малака, кефіру, смятаны і тварагу, ялавічыны і свініны, хлеба і хлебабулачных вырабаў можа праводзіцца не вышэй за гэтыя памеры», — гаворыцца ў пастанове Мінэканомікі.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў галоўным упраўленні эканомікі Мінсельгасхарча, павелічэнне гранічных адпускных цэнаў на названую прадукцыю адбылося пасля павышэння закупачных цэнаў на збожжа і жывёлагадоўчую прадукцыю. Павелічэнне гранічных адпускных цэнаў абумоўлена падаражэннем кошту сельгассыравіны, ростам цэнаў на выкарыстоўваемыя паліўна-энергетычныя і матэрыяльныя рэсурсы, а таксама звязана са стратнасцю і нізкай рэнтабельнасцю вытворчасці сацыяльна значных харчовых тавараў.

«Фальшыўкі» ад «валютчыка»

За мінулыя выхадныя ў «валютчыкаў» праваахоўнікамі было канфіскавана 18 тысяч долараў ЗША, 750 еўра, 11 тысяч расійскіх рублёў і 40 мільёнаў беларускіх рублёў.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, павучальная гісторыя для грамадзян, якія адважаюцца мець справу з «валютчыкамі», адбылася ў Магілёве. Мясцовы жыхар у нядзелю ў абменным пункце аднаго з банкаў горада спрабаваў абмяняць100-доларавую банкноту. Аднак мужчыну тут чакаў непрыемны сюрпрыз: грошы аказаліся фальшывымі. Як высветліася, магіляўчанін не так даўно вярнуўся з Расіі, дзе знаходзіўся на заробках. На радзіме ён вырашыў расійскія рублі канвертаваць у долары і для гэтага скарыстаўся паслугамі «мянялы». У выніку сваёй неабачлівасці небарака атрымаў 14 фальшывак наміналам па 100 долараў кожная.

Ігар ГРЫШЫН.

Зберажэнні насельніцтва: гарантыі павышаюцца...

З пачатку наступнага года Нацыянальны банк павышае патрабаванні да мінімальнага памеру ўласнага капіталу банкаў, якія прыцягваюць сродкі насельніцтва ва ўклады (дэпазіты), паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

Адпаведныя змяненні прадугледжваюцца пастановай галоўнага банка, што была прынята ў мінулую пятніцу. Нагадаем, што на сёння мінімальны памер нарматыўнага капіталу для беларускіх банкаў, якія працуюць з укладамі фізічных асобаў, роўны суме, якая эквівалентна 10 мільёнам еўра. З 1 студзеня 2009 года ён для банкаў, якія прэтэндуюць на атрыманне права на прыцягненне грашовых сродкаў фізічных асобаў, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, ва ўклады (дэпазіты) і (ці) адкрыццё і вядзенне іх банкаўскіх рахункаў, павялічваецца да сумы, якая эквівалентная 25 мільёнам еўра.

Як зазначаюць спецыялісты Нацыянальнага банка, гэтае рашэнне прынята з мэтай павышэння гарантый захаванасці грашовых зберажэнняў насельніцтва ва ўсіх банках незалежна ад сумаў, тэрмінаў, валют укладаў, а таксама стварэння высокага запасу трываласці саміх банкаў. Да таго ж, падкрэсліваюць спецыялісты, рост капіталу банкаў будзе спрыяць павышэнню іх міжнароднага прызнання, дзелавой рэпутацыі і паляпшэнню рознічных паслуг, якія імі прадастаўляюцца, што, у сваю чаргу, павысіць узровень даверу насельніцтва да банкаўскай сістэмы.

Дарэчы, для дзеючых банкаў, якія атрымалі права на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый па прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асобаў да 1 студзеня 2009 года, нарматыўны капітал якіх не будзе адпавядаць мінімальнаму патрабаванню, што ўстанаўліваецца, прадугледжаны тэрмін давядзення нарматыўнага капіталу да неабходнага памеру да 1 студзеня 2010 года. А вось магчымасць гэтых банкаў па прыцягненні грашовых сродкаў насельніцтва ва ўклады (дэпазіты) на азначаны перыяд будзе абмежавана фактычным памерам іх нарматыўнага капіталу.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБАМА ЗАХОЎВАЕ ЛІДАРСТВА

Кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Дэмакратычнай партыі Барак Абама працягвае лідзіраваць у перадвыбарнай гонцы. Па інфармацыі Gallup, 30 кастрычніка — 1 лістапада 51 працэнт амерыканскіх выбаршчыкаў аддавалі свае перавагі Абаме, а рэйтынг яго саперніка, рэспубліканца Джона Макейна, складаў 43 працэнты.

Паводле даследавання Reuters, C-SPAN і Zogby, рэйтынг Абамы і Макейна 2 лістапада складаў 50,9 і 43,8 працэнта адпаведна. Прыкладна тыя ж прапорцыі захоўваюцца і ў выніках даследаванняў іншых сацыялагічных арганізацый і СМІ.

Выбары прэзідэнта ЗША пройдуць сёння. Першыя вынікі будуць падведзены ў ноч на 5 лістапада.

ПАЛІТОЛАГІ: ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ У ЗША РАСІЯ ЗАВАЮЕ УКРАІНУ, ПРЫБАЛТЫКУ І ПОЛЬШЧУ?

Пасля прэзідэнцкіх выбараў у ЗША амерыканскае кіраўніцтва мае намер справакаваць узброены канфлікт паміж Расіяй і Украінай, заявіў у панядзелак на прэс-канферэнцыі ў Маскве дырэктар Міжнароднага інстытута палітычнай экспертызы Яўген Мінчанка.

Паводле меркавання Мінчанкі, на правакаванне ваеннага канфлікту амерыканскую эліту падштурхоўвае логіка фінансавага крызісу. Як адзначыў эксперт, «з глабальнага крызісу сусветнага капіталізму Амерыцы ўдалося выкараскацца толькі ў выніку Другой сусветнай вайны, якая дала рост амерыканскай эканоміцы». Так і цяпер, у настроях амерыканскай эліты прысутнічае спакуса менавіта за кошт знешняга канфлікту вырашыць свае ўнутраныя праблемы, перакананы эксперт. Верагоднасць рэалізацыі такога сцэнарыя будзе нашмат вышэйшай, калі прэзідэнтам ЗША стане Джон Макейн.

Кансерватыўная група Focus on Family, якая падтрымлівае рэспубліканскую партыю, намалявала яшчэ больш «чорны» сцэнарый таго, што адбудзецца ў свеце, калі прэзідэнтам ЗША стане дэмакрат. Падрыхтаваны кансерватарамі прагноз паказвае, што ўжо праз чатыры гады на Польшчу паляцяць расійскія бомбы і ракеты, а Украіну захопяць расійскія войскі.

ПРЫДНЯСТРОЎСКІЯ ПАМЕЖНІКІ НЕ ПУСЦІЛІ ПРЭЗІДЭНТА МАЛДОВЫ Ў РОДНУЮ ВЁСКУ

Прэзідэнта Малдовы Уладзіміра Вароніна не пусцілі ў Прыднястроўе, куды ён накіроўваўся разам з мітрапалітам Малдовы на асвячэнне царквы сваёй роднай вёскі Каржова.

Як паведамілі ва ўрадзе Малдовы, памежнікі непрызнанай рэспублікі заявілі, што не атрымалі ўказанняў ад лідара Прыднястроўя Ігара Смірнова на пропуск Варонііна. У выніку картэж развярнуўся і з'ехаў у Кішынёў. З 2001 года прэзідэнт Малдовы не меў магчымасці наведваць родную вёску, бо Смірноў забараніў яму ўезд пасля чарговага абвастрэння адносінаў паміж Цірaспалем і Кішынёвам.

ЗОНА ЕЎРА ПЕРАЖЫВАЕ ЭКАНАМІЧНЫ СПАД

Зона еўра фактычна ўвайшла ў фазу эканамічнага спаду, хоць ён і не з'яўляецца глыбокім, перадаюць інфармагенцтвы са спасылкай на паўгадавы даклад Еўракамісіі, прысвечаны эканамічным перспектывам 15 краін зоны еўра.

На думку Еўракамісіі, у трэцім і чацвёртым квартале гэта года сукупны ВУП гэтых 15 краін скароціцца.

Між тым у 2009 годзе эканоміка краін зоны еўра адновіць свой рост, аднак ён будзе нязначным — 0,1 працэнта. Пры гэтым вядучыя эканомікі зоны еўра — Германія, Францыя і Італія — не пакажуць прыросту ВУП, але і не зафіксуюць у 2009 годзе яго падзенне, прыходзіць да высновы Еўракамісія.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Воложинского районного исполнительного комитета

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г. Воложине, в том числе:

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, бел. руб.	Инфраструктура
1	ул. Огинского, 6	622050100017000031	0,15	2 199 120	1 269 215	в непосредственной близости имеются линии электроснабжения, газоснабжения, водопровода
2	ул. Горецкого, 17	622050100021000006	0,15	2 199 120	1 247 668	
3	ул. Сахарова, 19	622050100060000004	0,15	2 101 500	1 247 668	

Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.11.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША 2 121,00
1 еўра 2 719,76
1 латвійскі лат 3 833,71
1 літоўскі літ 787,25
1 чэшская крона 112,39
1 польскі злоты 767,64
1 расійскі рубель 78,23
1 украінская грыўня 360,41

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD 27,0793
10 UAH 34,4828
1000 BYR 12,8125
EUR 45,7421

Курс у гандлёвых кампаніях (на 3.11.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Вёска Белы лясок. Пружанскі раён. Фота Анатоля КЛЕЦКУКА.

ПАСТАНОВА ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ ВЫБРАННІ СТАРШЫНЯЎ ПАСТАЯННЫХ КАМІСІЙ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях Самасейку Мікалая Леанідавіча.

2. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай бяспецы Гумінскага Віктара Аляксандравіча.

3. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Байкова Васіля Міхайлавіча.

4. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрных пытаннях Крыжэвіча Сяргея Іванавіча.

5. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Здановіча Уладзіміра Мацвеевіча.

6. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Юшкевіча Аляксандра Мікалаевіча.

7. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД Маскевіча Сяргея Аляксандравіча.

8. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні Русага Міхаіла Іванавіча.

9. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы Антоненку Аляксандра Ільіча.

10. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці Арцюшэнку Яўгена Антонавіча.

11. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Лаўрукевіч Ганну Мікалаеўну.

12. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Вялічку Алега Іванавіча.

13. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Палянскую Галіну Уладзіміраўну.

14. Выбраць старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве Сямашку Сяргея Аляксандравіча.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА

30 кастрычніка 2008 г., г. Мінск.
№ 9–П4/1

ЧАС ПЛАЦІЦЬ ЗА НЕРУХОМАСЦЬ

Па маёмасных падатках неабходна разлічыцца да 15 лістапада

Штогод да сярэдзіны апошняга месяца восені пэўная частка нашага насельніцтва аплачвае зямельны падатак і падатак на нерухомасць. Хто, як і калі павінен аплачваць маёмасныя падаткі? На гэтыя і іншыя пытанні «Звяздзе» адказаў галоўны дзяржаўны падатковы інспектар галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЗЕЛЯНКОЎСКІ.

— Якую колькасць насельніцтва сёлета закране пытанне аб маёмасным падатку?

— Па выніках праведзенага ўліку сёлета ў нашай краіне 2 мільёны 377 тысяч 917 плацельшчыкаў зямельнага падатку і 2 мільёны 265 тысяч 234 плацельшчыкі падатку на нерухомасць. У параўнанні з мінулым годам колькасць плацельшчыкаў зямельнага падатку павялічылася амаль на 23 тысячы чалавек і на 41 тысячу чалавек стала плаціць больш падатак на нерухомасць. Гэта сведчыць аб павелічэнні колькасці карыстальнікаў зямельнымі ўчасткамі і прыватных уладальнікаў жыллёвых і камерцыйных пабудоў.

— Колькі грошай за кошт маёмасных падаткаў сёлета атрымае дзяржава?

— Агульны аб'ём падлічаных маёмасных падаткаў па краіне складае больш за 110 млрд рублёў. Разам з тым за кошт таго, што істотная частка насельніцтва мае льготы па маёмасных адлічэннях, ад гэтай сумы прад'яўлена да аплаты маёмасных падаткаў у аб'ёме каля 54 млрд рублёў. Сярэдняя сума прад'яўленага падатку на нерухомасць на аднаго плацельшчыка склала 31 тысячу, а зямельнага падатку — 16 тысяч рублёў.

— Ці павінны гаспадары двух і больш жылых памяшканняў у шматкватэрных дамах аплачваць падатак на нерухомасць?

— Так. Згодна з законам «Аб падатку на нерухомасць», ад падаткаабкладання вызваляецца толькі адно жылое памяшканне (кватэра, пакой) у шматкватэрных дамах. Сёлета на ўліку падатковых органаў знаходзіцца 31 тысяча 83 фізічныя асобы, якія маюць ва ўласнасці два і больш жылых памяшканняў у шматкватэрных дамах. Менавіта гэта катэгорыя грамадзян плаціць падатак на нерухомасць. Сярэдняя сума падатку на нерухомасць для іх складае сёлета каля 37 тысяч рублёў у год. Інспекцыі налічваюць гэтыя падаткі па звестках Нацыянальнага кадастравага агенцтва Беларусі, дзе зафіксаваны ўласнікі аб'ектаў нерухомасці і плошчы займаемых зямельных участкаў.

— Які алгарытм аплаты маёмасных падаткаў?

— Плата маёмасных падаткаў насельніцтвам ажыццяўляецца толькі на падставе падатковых паведамленняў, якія дасылаюцца плацельшчыкам падатковымі службамі. Фізічная асоба не падлічвае падаткі самастойна. У паведамленні дакладна распісваецца: хто павінен плаціць, колькі і ў якія тэрміны. Там паказваецца плошча зямельнага ўчастка, стаўка і сума падатку. Па лініі падаткаў на нерухомасць паказваецца ацэначны кошт аб'екта (жылы дом, дача, садовы домік, іншыя пабудовы), стаўка падатку і яго канчатковы памер.

Заплаціць падаткі можна ў банках, у падатковых органах, у сельскіх распарадчых і выканаўчых органах ці па пошце. Тэрмін выплаты маёмасных падаткаў — не пазней за 15 лістапада кожнага года.

— Што будзе, калі чалавек спазніцца?

— За кожны дзень пратэрміноўкі налічваецца пеня, якая не вельмі вялікая. За нявыплату ці няпоўную плату падаткаў фізічнай асобай прадугледжаны штраф у памеры 15 працэнтаў ад сумы нявыплачаных падаткаў, але не менш за адну базавую велічыню. Калі чалавек наўмысна не плаціць, то штраф павялічваецца да 20 працэнтаў, але не менш як 5 базавых велічынь.

— Жыхары Мінска будуць плаціць зямельны падатак па іншым механізме ўжо сёлета?

— Так. З пачатку ліпеня 2008 года пачаў дзейнічаць Указ Прэзідэнта Беларусі № 365 «Аб плацяжах за зямлю ў г. Мінску». Згодна з гэтым дакументам, пачынаючы з ліпеня зямельны падатак падлічваецца зыходзячы з кадастравага кошту зямельнага ўчастка. Цяпер уся тэрыторыя Мінска падзелена на 283 ацэначныя зоны. Згодна з гэтымі зонамі, зямельны падатак дарагога ўчастка ў прэстыжным раёне істотна павялічыцца ў параўнанні з пакуль не вельмі ліквіднымі тэрыторыямі. На наш погляд, цяпер пачаў дзейнічаць больш справядлівы механізм падаткаабкладання. Напрыклад, кошт квадратнага метра зямлі ў цэнтры горада будзе істотна большым, чым у пасёлку Сокал Кастрычніцкага раёна сталіцы. Кадастравы кошт зямельнага «квадрата» ў прыватным сектары гэтага пасёлка складае каля 24 тысяч рублёў, а самы высокі кошт квадратнага метра прысядзібнага ўчастка сталіцы складае каля 324 тысяч рублёў. Згодна з указам, стаўка зямельнага падатку складае 0,05 працэнта ад кадастравага кошту зямельнага ўчастка. Акрамя гэтага, рашэннем Мінскага Савета дэпутатаў «Аб бюджэце на 2008 год» выкарыстоўваюцца павышальныя каэфіцыенты да ставак зямельнага падатку розных катэгорый плацельшчыкаў.

— Хто мае льготы па выплаце маёмасных падаткаў?

— Ад выплаты маёмасных падаткаў вызваляюцца пенсіянеры па ўзросце, інваліды I і II груп, шматдзетныя сем'і, вайскоўцы тэрміновай службы. Разам з тым трэба адзначыць, што заканадаўства не можа прадугледзець усіх магчымых складаных жыццёвых сітуацый падаткаплацельшчыкаў. Менавіта таму законам аб бюджэце прадастаўляецца права органам улады вызваляць пэўныя катэгорыі грамадзян ад выплаты падаткаў. Для гэтага фізічная асоба павінна звярнуцца з пісьмовай заявай да мясцовых органаў улады. Вызваленне ад выплаты маёмасных падаткаў можа быць поўным ці частковым.

Сяргей КУРКАЧ.

Маці з сынам выпіла...

Брыгада хуткай меддапамогі ў кватэры па вул. Піянерскай у Брэсце выявіла мёртвага, які загінуў ад удару нажом у жывот.

Пазней высветлілася, што маці з сынам напачатку выпівалі, а затым пасварыліся. Жанчына схапіла кухонны нож і нанесла ўдар 24-гадоваму сыну.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ХУТЧЭЙ — ДАРАЖЭЙ

Карэспандэнт «Звязды» разам з супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці ўчынілі «паляванне» на ліхачоў

Траса Мінск — Маладзечна — Нарач, на якой мы працавалі, лічыцца адной з самых ажыўленых і самых небяспечных на Мяншчыне. Амаль на ўсёй тэрыторыі дарогі маецца па адной паласе ў кожным накірунку, а мноства паваротаў і населеных пунктаў толькі пагаршаюць сітуацыю.

Для выяўлення ліхачоў на гэты раз быў арганізаваны так званы схаваны кантроль. Некаторыя вадзіцелі здзіўляліся — парушэнне было недзе за два кіламетры ад месца нясення службы асноўнага наряда ДПС, а відэафакт аб парушэнні ўжо ёсць. Толькі за пару хвілін Дарожна-патрульная служба Дзяржаўтаінспекцыі Маладзечанскага РАУС у вёсцы Чырвонае затрымала чатырох вадзіцеляў, у якіх перавышэнне хуткасці было не жартоўным — у двух — ад 20 да 30 км/г, у аднаго — больш за 30 кіламетраў. Дарэчы, менавіта за такія хуткасныя парушэнні Дзяржаўтаінспекцыя прымяняе самыя строгія меры. Нагадаем: перавышэнне ад 10 да 20 км/г — штраф да 1 базавай велічыні (35 тысяч), ад 20 да 30 — штраф ад 35 да 70 тысяч, больш за 30 км/г — штраф ад 2 да 10 базавых велічынь (да 350 тысяч), а за паўторнае парушэнне — штраф ад 4 да 15 базавых велічынь або пазбаўленне вадзіцельскага пасведчання да аднаго года.

Яшчэ адно найбольш частае парушэнне правілаў дарожнага руху на трасе Мінск — Маладзечна — Нарач, паводле слоў інспектара ДПС Дзяржаўтаінспекцыі Маладзечанскага РАУС Паўла Анопа, — гэта абгон:

— На аўтадарозе службу мы нясём з пятніцы па нядзелю ўключна. Звязана гэта з тым, што менавіта ў гэтым раёне знаходзіцца шмат дачных пасёлкаў. У

так званы час пік ідзе суцэльная калона, і некаторыя вадзіцелі ўмудраюцца абганяць транспартныя сродкі і справа! Як вынік — кювет і ДТП.

Згодна са статыстыкай, за 2008 год на дарозе Мінск—Маладзечна—Нарач было зарэгістравана 46 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 10 чалавек загінулі і 58 атрымалі пашкоджанні. Менавіта з мэтай прафілактыкі аварый з 29 кастрычніка праводзілася адпрацоўка яшчэ такіх аўтадарог, як Мінск—Магілёў і Мінск—Мікашэвічы. Увесь гэты тыдзень супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці будуць патруляваць аўтадарогі Мінск—Калачы—Мядзел, Слабада—Навасады, Мінск—Гомель.

Марына БЕГУНКОВА.
Фота аўтара.

в. Чырвоная, Маладзечанскі раён.

НАЕХАЎ, АЛЕ...

Вадзіцель, жыхар в. Зорнае, што пад Баранавічамі, заявіў у міліцыю, што на краі дарогі ён знайшоў мужчыну з цяжкімі цялесным пашкоджаннямі.

Пазней пацярпелы памёр у рэанімацыйным аддзяленні. Судова-медыцынская экспертыза ўстанавіла — мужчына загінуў пад коламі аўтамашыны. Высветлілася, што наезд зрабіў на а/м «Фольксваген-Транспарцёр» вадзіцель, які заявіў у міліцыю.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Абзац

■ Рызыка развіцця інсульту выяўлена ў 42 працэнтаў удзельнікаў агульнагарадской медыцынскай акцыі «Разам супраць інсульту», якая прайшла ў Мінску. Пры гэтым вельмі высокая рызыка інсульту выяўлена ў 180 чалавек, у сувязі з чым яны тэрмінова былі адпраўленыя на аказанне дапамогі ў РНПЦ «Неўралогія». Усяго да медыкаў звярнуліся 23,5 тыс. чалавек, больш за 65 працэнтаў з іх — жанчыны.

■ **За трое сутак на дарогах рэспублікі адбылося 64 ДТЗ, у якіх 15 чалавек загінулі і 68 атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.**

■ У Глуску міліцыяй затрыманы ўрач раённай бальніцы, які выпісаў за ўзнагароджанне рэцэпты для набыцця псіхатропных рэчываў. 60-гадовы неўрапатолаг на працягу месяца выпісаў 5 рэцэптаў на падстаўныя асобаў. Узбуджана крымінальная справа.

■ **У Саратаўскай вобласці расследуецца жорсткае забойства грамадзяніна Арменіі, учыненае трыма міліцыянерамі. Не атрымаўшы патрэбных ім паказанняў, вартавыя парадку аблілі затрыманага бензінам і зажыва спалілі. Мяркуемыя забойцы ў пагонах ужо далі прызнальныя паказанні. Прэс-служба ГУУС распаўсюдзіла інфармацыю толькі пасля таго, як пра гэта напісалі саратаўскія СМІ.**

■ Славуты італьянскі «горад каналаў» Венецыя апынуўся затопленым. З-за шторму на моры і моцных дажджоў узровень вады ў Адрыятычным моры ўзняўся больш чым на метр, у выніку чаго вада ў венецыянскіх каналах разлілася і затапіла цэнтральныя вуліцы і плошчы горада, з гісторыяй больш за 14 стагоддзяў. Сярод іншага затопленай аказалася знакамітая плошча Сан-Марка, чый архітэктурны ансамбль прызнаны сусветным шэдэўрам. Пад ваду пайшлі і масты цераз каналы. Аднак паток турыстаў не спыніўся, падарожнічаць па горадзе можна, як і раней, на гандолах.

■ **Брытанскі банкір-мультымільянер выйграў у латарэю пажыццёвае забеспячэнне. Брытанец будзе атрымліваць па мільёну доларaў у год да канца жыцця. Ён купіў тры латарэйныя білеты і адзін з іх аказаўся выйгрышным. За вылікам падаткаў сума штогадовых адлічэнняў, якую будзе атрымліваць шчасліўчык, складзе каля 940 тысяч доларaў.**

■ 11-гадовая жыхарка Гавайскіх астравоў на распродажы, які арганізавала «Армія выратавання», знайшла старую відэакасету, унутры якой знаходзіліся 10 стодоларавых купюр. Свядомая дзяўчынка паведаміла пра сваю знаходку маці і папрасіла яе аддаць грошы персаналу магазіна. Па словах дзяўчынкі, яна вырашыла, што «Армія выратавання» зможа расходаваць гэтыя грошы на карысць бедных.

■ **Тэлевізійны пульт дыстанцыйнага кіравання — галоўны распаўсюджвальнік грыпу ў жылых і службовых памяшканях, паведамілі даследчыкі з амерыканскага ўніверсітэта ў штаце Вірджынія. Вучоныя правялі аналіз найбольш крызісных участкаў кватэр і офісаў з пункту гледжання ступені небяспекі падчапіць грыпозныя вірусы. У выніку на першае месца выйшаў пульт дыстанцыйнага кіравання тэлевізарам, які гуляе па руках усіх членаў сям'і або працоўнага калектыву. Услед ідуць дзвярныя ручкі, водаправодныя краны і ручка халадзільніка.**

■ Сёння праваслаўныя вернікі адзначаюць свята Казанскага абраза Божай Маці — адной з самых шануемых у праваслаўі святыняў. Казанская Божая Маці лічыцца заступніцай праваслаўных зямель, а таксама збавіцелькай ад душэўных і фізічных пакутаў.

Поўны абзац

■ Трэнажорныя залы В'етнама могуць стаць вельмі папулярнымі пасля таго, як урад выканае свае намеры па ўкараненні забароны на ваджэнне матацыкла людзьмі з недастатковa шырокімі грудзямі. Згодна з праектам новага закона, тыя, чые грудзі ў дыяметры не дасягаюць 71 см, пазбаўляюцца права вадзіць матацыкл. Мэта забароны — адгарадзіць занадта худых, занадта нізкіх і занадта слабых людзей ад ваджэння небяспечнага сродку перамяшчэння, так як яны маюць павышаную рызыку трапіць у ДТЗ. Пазбаўленне права вадзіць «жалезнага каня» чакае таксама в'етнамцаў з такімі захворваннямі, як павялічаная печань і сінуіт (захворванне носавых пазух). Між тым у многіх в'етнамскіх жанчын невялікія грудзі, сярэднестатыстычны в'етнамец наогул не вышэй за 155 см, а жанчыны і яшчэ менш. Адпак менавіта матацыклы складаюць 90 працэнтаў транспарту ў В'етнаме.

■ Глуханямая жанчына Марыя Бартачыні, якая жыве ў італьянскай сталіцы, атрымала па пошце штраф у памеры 68 еўра за тое, што размаўляла па сотавым тэлефоне, знаходзячыся за рулём аўтамабіля. Італьянка абскардзіла абсурдны штраф праз адваката. Міравы суддзя мусіў згадзіцца: паліцэйскія, якія выпісалі штраф, не спыніўшы чалавека, памыліліся. Суд прыгаварыў мэрыю да выплаты ўсіх судовых выдаткаў, анулявання штрафу і вяртання 5 ачкоў на вадзіцельскія правы іх уладальніцы.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства,

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства изолированного производственного помещения малярного участка, об. пл. 352,3 кв.м, расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Промышленная, д. 4. Начальная цена – 84 560 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Пуховичского райисполкома

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г. Марьина Горка:

№ лота	Адрес, площадь земельного участка, кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы, связанные с подготовкой документации (бел. руб.)
1	ул. Цветочная, д. 11, пл. 0,0987 га, 624450100001002708	2 000 000	541 077
2	ул. Тенистая, д. 1, пл. 0,1098 га, 624450100001002709	2 250 000	533 992
3	пер. Тенистый, д. 6, пл. 0,1083 га, 624450100001002710	2 200 000	541 077
4	ул. Осенняя, д. 7, пл. 0,1032 га, 624450100001002711	3 000 000	541 077

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 10.12.2008 г.

Фонд «Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже объекта коммунальной собственности г. Минска

1	**Наименование объекта**	Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D – 7058721 (помещение неустановленного назначения)
2	**Местонахождение объекта**	Проспект Независимости, 93, пом. 9Н
3	**Общая площадь (м.кв.)**	10,5
4	**Начальная цена продажи (руб.)**	33 000 000
5	**Сумма задатка (руб.)**	3 300 000
6	**Сроки оплаты объекта**	Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи
7	**Характеристика строения**	Стены кирпичные, перекрытия деревянные, полы бетонные, проемы деревянные
8	**Условия продажи**	В 15-дневный срок со дня подписания договора купли-продажи направить документы для регистрации договора купли-продажи в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». В месячный срок после приемки Объекта направить документы для государственной регистрации перехода прав в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». В месячный срок после подписания акта приема-передачи подписать охранное обязательство и зарегистрировать его в департаменте по охране историко-культурного наследия и реставрации при Министерстве культуры Республики Беларусь

1) Аукцион состоится **10 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

2) Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность;

представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представители юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

- руководитель юридического лица – документ о его назначении или избрании, а при необходимости – документ о его полномочиях, согласно уставу юридического лица;

- иные представители – доверенность, оформленную согласно учредительным документам юридического лица.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

соглашение о правах и обязанностях сторон;

заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены;

б) платы за участие в аукционе в размере 4-х базовых величин. Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк», по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов по продаваемому объекту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.

Победитель аукциона обязан произвести оплату организатору аукциона за подготовку и проведение аукциона в размере 4 процентов от начальной цены продаваемого объекта и 5 процентов от суммы превышения цены продажи над начальной.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **9 декабря 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: 227 40 22, 228 48 36. Интернет: www.mgcn.by

УНП 190398583

ПРАВЯДЗЕННЕ ЎСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ МАНАПАЛІЗАВАНА... ДЗЯРЖАВАЙ

(Працяг. Пачатак палемікі ў нумары за 1 лістапада.)

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў уважліва прачыталі пісьмо А. Мельнікава і А. Чарняка «А ці трэба нашаму грамадству такое цэнтралізаванае тэсціраванне?», у якім аўтары ўсур'ёз занепакоены тым, што «захаванне ЦТ у яго цяперашняй форме здольнае нанесці непапраўны ўрон будучаму нашай краіны». Паколькі абвінавачанні, выстаўленыя супраць сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання, дастаткова сур'ёзныя, мы не можам іх пакінуць без увагі.

1. «...у апошнія гады сталі ўпарта множыцца чуткі аб уцечцы закрытай інфармацыі аб ЦТ»; «Так, усё гэта можна было б назваць домысламі няўдачнікаў»; «тая ж ўстойлівая погаласка аб падрыхтоўцы «па вядомых варыянтах».

А. Мельнікаў і А. Чарняк, выкарыстоўваючы ў сваім пісьме словы (словаазлучэнні) «чуткі», «пагаласка», «домыслы няўдачнікаў» робяць нечаканую выснову — гэта «дакладныя факты». Далей на падставе «дакладных фактаў» пытаюцца: «Што гэта: непрафесіяналізм складальнікаў тэстаў або злоўжыванне тых, хто мае да іх доступ?».

Сапраўды, хто ж удзельнічае ў падрыхтоўцы і правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання?

Сярод аўтараў тэставых матэрыялаў 11 дактароў навук, 85 кандыдатаў навук, больш як 60 настаўнікаў і метадыстаў вышэйшай катэгорыі. Экспертызу тэставага матэрыялу праводзяць 28 дактароў і кандыдатаў навук, 11 настаўнікаў вышэйшай катэгорыі. Акрамя таго, знешнюю незалежную экспертызу тэстаў (пасля правядзення тэсціравання) праводзіць Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Камітэт дзяржаўнага кантролю.

Указам Прэзідэнта ствараецца Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам правядзення ўступных выпрабаванняў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. У склад гэтай камісіі ўваходзяць прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў, у тым ліку Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Камісія ажыццяўляе поўны кантроль як за дзейнасцю РІКВ, так і ўсіх устаноў, якія задзейнічаны ва ўступнай кампаніі.

2. «...то там, то тут, напярэдадні чарговага тэсціравання фіксаваліся выпадкі наяўнасці ў некаторых абітурыентаў шаблонаў правільных адказаў і варыянтаў заданняў»; «Сёлета «Комсомольская правда» адразу пасля ЦТ па матэматыцы паведаміла, што варыянты ЦТ былі прадастаўлены газеце адным з чытачоў за дзень да тэсціравання, і апублікавала некаторыя задачы 25 чэрвеня».

І далей аўтары пісьма адзначаюць: «Яснага адказу з боку адміністрацыі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў не паступіла».

Адказ можа быць пры наяўнасці пытання, якога ў А. Мельнікава і А. Чарняка няма. А вось іх сцвярджэнні-домыслы выклікаюць наступныя пытанні:

1) Кім «фіксаваліся выпадкі наяўнасці ў некаторых абітурыентаў шаблонаў правільных адказаў і варыянтаў заданняў»?

2) Каму «Комсомольская правда» адразу пасля ЦТ па матэматыцы паведамляла, што варыянты ЦТ былі прадастаўлены газеце адным з чытачоў за дзень да тэсціравання, і апублікавала некаторыя задачы 25 чэрвеня»?

3) Што такое «шаблоны правільных адказаў і варыянтаў заданняў»?

4) Дзе знаходзіцца «то там, то тут»?

Акрамя таго, заўважым, што «ўцечка некаторых задач», якая здарылася на шосты дзень пасля цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы (ЦТ праходзіла 19 чэрвеня; «Комсомольская правда» апублікавала некаторыя задачы 25 чэрвеня, наўрад ці можа быць цікавай.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, нягледзячы на адсутнасць доказаў па факце так званай «уцечкі», быў праведзены параўнальны аналіз задач тэставых варыянтаў, прадстаўленых на цэнтралізаваным тэсціраванні 2008 года, і задач, апублікаваных у газеце «Комсомольская правда» 25 чэрвеня 2008 года.

Праведзены параўнальны аналіз не пацвердзіў супадзенняў.

Але, дзеля аб'ектыўнасці, неабходна адзначыць: прадбачыць сюжэты заданняў, што прапануюцца на ЦТ, становіцца з году ў год усё прасцей, бо дыяпазон праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы не шырокі.

3. «...тайнай за сямю пячаткамі застаюцца правілы (а ці ёсць гэтыя правілы ўвогуле?) фарміравання камандаў экспертаў, якія адказваюць за складанне варыянтаў».

Пры фарміраванні каманды экспертаў і аўтараў тэставых матэрыялаў улічваецца адно простае і непахіснае правіла: гэта павінен быць спецыяліст высокага класа, прыстойны, добрасумленны, працавіты, адказны чалавек.

Што датычыцца ратацыі экспертаў і аўтараў тэставых матэрыялаў, аб якой узгадваюць аўтары пісьма, то і ў адміністрацыі інстытута няма сумненняў у яе неабходнасці. Каманды экспертаў і аўтараў рэгулярна абнаўляюцца.

4. «...абсалютна туманнымі для тых, хто паступае, застаюцца крытэрыі ацэньвання вынікаў тэсціравання...».

Методыка разліку тэставага бала ўзгоднена Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй і Нацыянальнай акадэміяй навук Рэспублікі Беларусь і зацверджана загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19.03.2008 г. № 179.

Кожны ахвотны, зайшоўшы на сайт інстытута (www.rikz.unibel.by) альбо набыўшы дапаможнік «Рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціравання 2009: аналіз памылак, каментарыі, методыка разліку тэставага бала, трэнажоры», можа азнаёміцца з методыкай разліку тэставага бала, якая выкарыстоўваецца пры правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання.

5. «...РІКВу фактычна аддадзена манапольнае права вызначаць адзін з найважнейшых кампанентаў нашага грамадскага жыцця — фарміраванне студэнцкага корпусу. І мяркуючы па ўсім, зроблена гэта было дачасна».

Так, правядзенне ўступных іспытаў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на сёння манапалізавана. Але яно манапалізавана не РІКВам, а дзяржавай. Менавіта дзяржава ўзяла на сябе адказнасць за забеспячэнне гарантый роўных правоў і магчымасцяў пры паступленні ў ВНУ і ССНУ. На ўзроўні ўказаў Прэзідэнта і пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь распрацаваны і дзейнічаюць нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентуюць працэдуру правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў краіне. Цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта дзяржаўная сістэма мерапрыемстваў, якая ўключае ў сябе не толькі арганізацыю і правядзенне ўступных іспытаў, але і забеспячэнне бяспекі, у тым ліку і інфармацыйнай, кантролю з боку ўпаўнаважаных органаў на ўсіх яго этапах.

6. «Паралельна са звужэннем тэматыкі ідзе адкрытая прымітывізацыя саміх заданняў, якая была асабліва прыкметнай сёлета».

Складанасць заданняў з'яўляецца адноснай характарыстыкай і залежыць як ад асаблівасцяў выбаркі тых, хто тэстуецца, так і ад мэты тэсціравання, патрабаванняў вучэбных праграм. Важна, каб у педагагічных тэстах, асабліва пры конкурсным адборы абітурыентаў, суадносіны складаных і простых заданняў адпавядалі магчымаму росквіту ў падрыхтаванасці кантынгенту тых, хто праходзіць іспыты. Інакш адзнакі могуць быць настолькі аднолькавымі, што канчатковы вынік не дазволіць дабіцца мэты ў адборы абітурыента

Набыць букет кветак і даведацца, ці надоўга зацягнецца кветкавы дэфіцыт

Карэспандэнт «Звязды» атрымаў заданне...

У мінулы панядзелак па дарозе на работу звярнула ўвагу на пустыя кветкавыя шэрагі побач са станцыяй метро «Інстытут культуры». Кветкавы крызіс панаваў на працягу некалькіх дзён па ўсёй сталіцы: многія гандлёвыя пункты зачыніліся, а тыя, што працавалі, прапаноўвалі надта непрывабны тавар... І толькі напрыканцы тыдня кіёскі на вуліцах і ў падземных пераходах зноў ажылі, напоўніліся яркімі букетамі.

Заквітнелі. Але ці надоўга?..

— Прывозіць кветкі з-за мяжы стала нявыгадна, — патлумачыла сітуацыю індывідуальны прадпрымальнік Ірына. — Пастанова № 183, выдадзеная Міністэрствам эканомікі ў пачатку верасня, абмежавала памер надбаўкі на імпартныя кветкі да 30 працэнтаў. Кветкі чамусьці не ўключылі ў пералік тавараў, кошт на якія фарміруецца свабодна. Таму цяпер мы вымушаны не жыць, а выжываць. Вось глядзіце, я закупляю за адзін раз каля дзвюх тысяч ружаў. Адна ружа каштуе, як мінімум, 3 тысячы рублёў. У выніку тавар мне абыходзіцца дзесьці ў 6 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, мне трэба заплаціць падатак за арэнду гандлёвага пункта, выплаціць зарплату супрацоўнікам. Не сакрэт, што кветкі — тавар, які хутка псуецца, таму 30 працэнтаў «прыгажосці» адпраўляецца ў сметніцу. Няцяжка падлічыць, што, каб пакрыць арэндныя плацяжы і мець хоць нейкі прыбытак, гандлёвая надбаўка павінна быць як мінімум 100 працэнтаў.

Мы звярталіся ў Міністэрства эканомікі з просьбай перагледзець пастанову. Хочацца верыць, што ўсё ж такі ўключаць кветкі ў пералік тых тавараў, кошт на якія рэгулюе рынак, — выказвае спадзяванне Ірына.

Хадзілі чуткі, што кошт на кветкі рэзка падскочыць. Але я пераканалася на свае вочы: пакупнікі цяпер набываюць кветкі амаль па тым жа кошце.

— Кошт на некаторыя кветкі падняўся на 200-300 рублёў — патлумачыў прыватнік, які адмовіўся адрэкамендавацца. — Не можам падняць больш, бо страцім кліента.

Адна ружа ў залежнасці ад распушчанасці бутона і даўжыні сцябла каштуе ад 4 да 12 тысяч рублёў. Букеты ў сярэднім прадаюць па 20 тысяч. Верхняй жа планкі кошту букетаў са зрэзаных кветак няма. Можна скласці на любую суму. Гэта залежыць ад кашалька і жадання пакупніка.

— Аднойчы мужчына прыехаў на джыпе і скупіў усе кветкі, такім чынам прасіў прабачэння ў жонкі. Але так шанцуе гады ў рады. У асноўным большасць пакупнікоў набываюць класічныя букеты ружаў ці хрызантэм.

— А чаму б вам не пачаць прадаваць беларускія кветкі?

— Сапраўды, у сённяшніх умовах нам было б нашмат выгадней прадаваць айчынны тавар. Але ў нашай краіне кветкавы бізнэс арганізаваны недастаткова. Клімат не дазваляе вырошчваць такія экзатычныя кветкі, якія вырошчваюць, напрыклад, галандцы. Акрамя таго, у беларускіх ружаў і бутоны не такія прыгожыя і буйныя, як у імпартных. А кошт не нашмат адрозніваецца. Таксама праблема ў тым, што нас, прадпрымальнікаў, шмат, а айчынныя кветкаводы маюць адносна невысокія аб'ёмы вытворчасці. І асартымент маленькі. Галандскія вытворцы заўсёды прапаноўваюць вялізны і пастаянны асартымент (зімой можна знайсці хоць бэз, хоць гладыёлус).

«Прабачце. Ідзе рэстаўрацыя...»

Сапраўды, сёння сітуацыя з беларускімі кветкамі надзвычай складаная. Кветак на продаж паступае мала, прадаўцы кажуць, што па 60 кветак у дзень пастаўляюць. А ў чацвер і пятніцу вазы магазіна «Кветкі сталіцы», што на праспекце Незалежнасці, наогул пуставаліе. Сярод мноства кветак у вазонах сіратліва стаяла зрэзаная жоўтая ружа, кошт якой 1750 рублёў.

Амаль палова ўсіх айчынных кветак вырошчваецца ў цяпліцах прадпрыемства «Кветкі сталіцы», якое падначалена сталічнаму «Зелянбуду», — расказвае прадавец шостага разраду Анжэла. — Айчынныя кветкі — ружы, цюльпаны, гваздзікі, калы, фрэзіі, стрэліцыі — добрыя тым, што каштуюць танней за імпартныя. І ў вазах стаяць даўжэй, бо прадаюцца літаральна праз дзень пасля таго, як іх зрэзалі. Цяпер на прадпрыемстве вядзецца рэканструкцыя большай часткі цяпліц. Таму вазы і пустуюць. У нас затое пастаянна шмат кветак у вазонах. Людзі з ахвотай іх набываюць не толькі сабе, але і ў падарунак.

«Дзетка, купі букецік. Нядорага»

З такімі словамі мяне сустрэла побач з гандлёвымі пунктамі індывідуальных прадпрымальнікаў жанчына з двума букетамі хрызантэм.

— Колькі каштуюць? — цікаўлюся.

— Усяго дзесяць тысяч букет. Прыватнікі побач у два разы больш просяць. Глядзіце, якія прыгожыя, і белыя, і бардовыя. Толькі што зрэзала. Стаяць будуць доўга.

У пераходзе цяпер таксама сезон хрызантэм. «Букеты для каханай» прадаюць у асноўным бабулі. Адна прадае за сем тысяч рублёў. Другая, убачыўшы, што я кручу носам, пераманьвае мяне на свой бок.

— Танней хочаш? Вазьмі ў мяне за шэсць. Я па 10 прадавала, а для цябе скідку зраблю, — прымяняе яна метады вопытнай гандляркі. — Ці вось паглядзі, якія я маю яркія букецікі з восеньскіх кветак. Два засталося. Вырошчваю кветкі ля дома ў палісаднік. Вельмі люблю рабіць з іх букеты. Нават калі б багатай была, усё роўна б рабіла.

У выніку я набыла аранжавую герберу, падобную на сланечнік, за 7 тысяч, для любімай сяброўкі, бо ёй не вельмі падабаюцца вялікія букеты ў цэлафане. Спадзяюся, што гэта была не апошняя кветка, якую я падарыла...

Надзея ДРЫЛА.

Фота Анатоля КІШЧУКА

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
по поручению Петровичского сельского исполнительного комитета

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Смолевичском районе:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)
1	д. Заямное, 624883804101000082	0,0999	Сети электроснабжения, водоснабжения	491 248	45 000
2	д. Петровичи, 624883808101000009	0,1492	Сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения	671 674	65 000

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона в сумме: Лот 1 – 628 879 рублей, Лот 2 – 595 248 рублей. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

№ лота	Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (снижена на 10 % бел. руб.)	Задаток
1	Одноэтажное кирпичное здание (состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, кран-балки)	851,1	г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5	387 976 500	10 %
2	Административное здание (2-этажное кирпичное)	474,9		464 497 200	10 %
3	Бокс гаражный	92,8		41 245 200	10 %
4	Шиферный склад	130,4		54 430 200	10 %

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **20 ноября 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **19 ноября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt .by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»,УНП 690324015

Мара дзяцінства спраўдзілася

Алег Ткач у грамадзянскай авіяцыі больш за 20 гадоў. Пасля заканчэння (з адзнакаю) Акцюбінскага вышэйшага лётнага вучылішча быў накіраваны ў Мінск — не пашкадаваў аб гэтым ні на хвілінку.

— І ўвогуле, лётчык — гэта нават не зусім прафесія, — усміхаецца Алег Уладзіміравіч. — Гэта — хвароба. З дзяцінства запала мара быць лётчыкам — і яна спраўдзілася. Хоць бацькі мае ніякага дачынення да авіяцыі не мелі.

Безумоўна, Алег прыклаў шмат намаганняў, каб мара стала явай. Цяпер Алег Ткач — прафесіянал вышэйшай пробы. Выконвае абавязкі камандзіра эскадрыллі. Яму падуладныя паветраныя караблі ТУ-134, 154, Ан-24, «Боінг» і CRJ (і такія цяпер ёсць у «Белавія»).

Парыж і Лондан, Берлін і Ерэван, Стамбул і Прага — далёка не поўны спіс рэйсавых палётаў Алега Уладзіміравіча. Чыстага неба, лётнага надвор'я вам, шаноўныя авіятары.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.
Фота аўтара.

Схіігумення Антонія паказвае абразы са знішчанага манастыра, якія вяртаюць людзі.

Спадчына

Баркалабаўскія падмуркі

Магілёўскія археолагі цяпер дакладна ведаюць, як выглядала адна з вялікіх праваслаўных святынь Беларусі XVII стагоддзя. А манахіні, якія пасяліліся на Быхаўшчыне, імкнуцца яе адрадзіць.

...На беразе Дняпра непадалёк ад вёскі Баркалабава старанна корпаюцца ў зямлі маладыя людзі. Нягледзячы на халодны вецер і досыць легкадумнае адзенне, моладзь за працай смяецца і пабеларуску падпявае мабільніку.

Студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта лічаць археалагічныя раскопкі вельмі цікавай справай, і пад рукамі ўпартых капальнікаў паступова праступаюць старажытныя скляпенні.

— Тут была царква Святога Іаана Прадцечы, альбо, як папросту казалі беларусы, Івана Галавасека, — тлумачыць загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін МДУ Ігар Марзалюк. — Гэта быў першы храм Баркалабаўскага праваслаўнага жаночага манастыра. Ён быў пабудаваны ў 30-х гадах XVII стагоддзя.

Марзалюк глядзіць на пляцоўку, дзе хаатычна раскіданыя валуны ды вялізная цэгла, і расказвае пра храм, нібыта бачыць яго насамрэч. Вось тут была званіца — бачыцца падмурак вежы. Роўныя лініі сцен, прыбудова з хрысцільняй, рэшткі трох печак.

— Паглядзіце, — Ігар трымае на далоні толькі што раскапаны керамічны кавалак, які праз стагоддзі захаваў колеры — бірузовы, жоўты і трохі ружовага. — Гэта фрагмент паліхромнай маёлікавай кафлі. Ёй былі аблiцаваныя печы ў храме, які быў цёплы. Мы сабралі тут сотні падобных кавалкаў. На іх ёсць фрагменты герба Магілёва. Тут працавалі магілёўскія майстры і рабілі для гэтага храма ўсё самае дарагое, багатае і шыкоўнае на той час.

Баркалабава — старажытны рэлігійны і культурны цэнтр Беларусі. Праваслаўны манастыр быў заснаваны на прыватных землях князёў Вялікага Княства Літоўскага Саламярэцкіх, уплываваго беларускага роду. Менавіта тут пісаўся знакаміты Баркалабаўскі летапіс — унікальны помнік беларускага летапісання. У манастыры захоўваўся абраз Маці Божай Баркалабаўскай, які і сёння праваслаўныя вернікі лічаць цудатворным.

Храмы былі разбураныя ў савецкі час. Манастыр, які называўся Свята-Вазнясенскім, знішчылі ў 1928 годзе. Некаторыя манаскія будынкі дастаялі да 1990-х гадоў — там быў дзіцячы лагер, але потым зруйнавалі і іх.

Цяпер Баркалабаўскі манастыр вырашылі аднавіць. Дзеля гэтага сёлета летам у Быхаўскі раён прыехалі 9 манашак на чале са схіігуменняй Антоніяй.

Знак адраджэння — усталяваны на пагорку вялізны крыж. На ім — невялікі абраз Божай Маці, упрыгожаны карункамі. Калі сонца заходзіць, то абраза кранаюцца апошнія сонечныя промні і асвячаюць яго цёплым святлом.

Побач з крыжом — драўляныя канструкцыі. Гэта аснова для палаткі, дзе будуць маліцца манашкі.

— Будзем шукаць печку-«буржуйку», каб узімку пачаць службы ў часовай царкве, — абяцае схіігумення Антонія.

Жанчына родам з Залахвення — вёскі, якая месціцца побач з Баркалабавам і манастырскай тэрыторыяй. У бацькоўскай хаце схіігумені Антоніі цяпер жывуць манахіні.

— Я вырашыла сюды вярнуцца, таму што тут святыня, — тлумачыць гаспадыня.

Яна працавала ў Магілёве, мела пасаду начальніка ў жыллёва-камунальнай сферы, але за свае рэлігійныя перакананні зведала ў 1970-я ганенні і ўрэшце пайшла працаваць у царкву. З цягам часу прыняла пострыг: жыла ў манастырах у Жыровічах, Полацку, Оршы, а потым прасіла аб адраджэнні Баркалабаўскага манастыра ў родных мясцінах.

Жанчына сталага ўзросту, Антонія хоча хоць бы пачаць справу ў Баркалабаве — потым яе працягнуць іншыя людзі. Што ж, цяжка пачынаць на пустым месцы, дзе нічога няма. Але справа ў тым, што схіігумення Антонія перакананая: Баркалабава — гэта сапраўды святое месца.

— У час вайны я была малой дзяўчынкай, але выдатна памятаю, як у нас на агародзе ўпала бомба, але не выбухнула, — расказвае яна. — Так было і з іншымі. У нас тут фактычна вайны не было. Немцы аднойчы прыехалі на матацыклах, але не спыніліся. Адзін старац, калі разбурылі манастыр, сказаў: будзе вайна, але гэты куточак яна не кране. Так і адбылося. Суседнія вёскі палілі і людзей забівалі, а мы тут засталіся цэлыя.

Гавораць, што Баркалабава ахоўвае абраз Божай Маці, які раней быў у манастыры і мае вядомасць далёка за межамі Беларусі. З ім звязана гісторыя з асабістага жыцця схіігуменні Антоніі: яна верыць, што зварот да Баркалабаўскай Божай Маці дапамог ёй выратаваць ад самагубства брата, які быў далёка ад яе.

— Я пасля страшнага сну прыхінулася да абраза, бо толкам маліцца яшчэ не ўмела, — узгадвае яна. — І Божая Маці зняла ўсе мае маркоты. А брат потым не мог паверыць і ўсё здзіўляўся, адкуль я даведалася пра яго страшныя намеры і як папярэдзіла іх.

Цяпер Баркалабаўскі абраз захоўваецца ў Быхаве, але манашкі ўпэўненыя, што з адраджэннем манастыра ён вернецца дадому. Праўда, да гэтай падзеі яшчэ далёка. Пакуль асноўная праца схіігуменні Антоніі і яе сясцёр складаецца з візітаў у розныя арганізацыі і на прадпрыемствы. Яны просяць грошы на манастыр, заключаюць дамовы на пастаўку будаўнічых матэрыялаў.

Адкрыты дабрачынны разліковы рахунак для адраджэння Баркалабаўскага манастыра, і туды ўжо паступіў мільён рублёў ад прыхільнікаў гэтай справы.

— Аднак пакуль не стае грошай, каб заплаціць 100 мільёнаў рублёў за праект, — гаворыць схіігумення Антонія. — Шукаем сродкі і настроены наступнай вясной пачаць будаўніцтва. Мы просім, і Бог нам дапамагае.

Менавіта з новым будаўніцтвам звязаны цяперашнія археалагічныя раскопкі. Магілёўскія гісторыкі супольна з інстытутам Акадэміі навук будуць ажыццяўляць археалагічны нагляд над будаўніцтвам.

Праца пачалася ўвосень з валанцёрскіх акцый: студэнты Магілёўскага дзяржуніверсітэта прыязджалі на выхадныя дні і збіралі смецце, разбіралі завалы, чысцілі тэрыторыю, потым прыступілі да раскопак.

Людзі, якія адраджаюць Свята-Вазнясенскі жаночы манастыр у Баркалабаве, маюць патрэбу ў дапамозе — рабочых руках альбо грошах. Калі хто хоча аказаць пасільную грашовую дапамогу: разліковы рахунак 3015004090322 у ААТ «ААБ Беларусбанк», філіял 706, код 539. З усімі пытаннямі можна патэлефанаваць у вёску Залахвенне, дзе жывуць схіігумення Антонія і манахіні: 80223130071.

— Мы цяпер дакладна ведаем, як першапачаткова выглядаў храм Іаана Прадцечы, — запэўнівае Ігар Марзалюк. — Памеры, тэхніка ўзвядзення, архітэктурныя асаблівасці і нават інтэр'ер. Паводле выкапак раскопак мы можам зрабіць дакладную рэканструкцыю храма, адкуль і з'яўляецца помнікам барока магілёўскай школы дойлідства. І, безумоўна, я вельмі хацеў бы, каб новая царква была падобная на старажытны храм.

Праўда, вельмі верагодна, што новы храм не ўдасца пабудаваць на дакладна тым жа месцы. Таму што яшчэ здаўна Днепр тут падмываў бераг, і небяспека спаўзання будынка ў раку застаецца і цяпер. Так што давядзецца адсунуць будаўнічую пляцоўку на некалькі дзясяткаў метраў ад ракі.

Між тым, магілёўскія археолагі працягваюць свае раскопкі.

— Мы мяркуем, што знайшлі пахаванне фундатара — аднаго з тых, хто стварыў гэты манастыр, альбо ігуменні, — тлумачаць маладыя археолагі.

— Гэтыя пахаванні — тут не адно, а некалькі — мы вылічылі металадэтэктарам, — дадае Ігар Марзалюк. — У храме хавалі толькі вельмі важных людзей. Верагодна, што гэта самі князі Саламярэцкія. Але спраўдзіцца гіпотэза альбо не — пакажуць будучыя раскопкі.

Акрамя ўсяго іншага, археолагі знайшлі пад Баркалабавам яшчэ і стаянку неаліту. Гэта значыць, што людзі пасяліліся там яшчэ ў каменным веку.

Сёння і магілёўскія гісторыкі, і мясцовыя жыхары ў Баркалабаўскай акрузе ўхваляюць аднаўленне жыцця ў гэтым старажытным месцы. Першыя гатовыя адсочваць будаўнічыя работы. Другія — дапамагаць манахіням у паўсядзённым жыцці.

Добрым знакам схіігумення Антонія і яе сёстры лічаць вяртанне абразоў з манастыра. Калі храмы зачыняліся, матушкі раздавалі каштоўнасці ў надзейныя рукі. Жыхары Быхава, якія даведаліся пра адраджэнне святыні, вярнулі манашкам старажытны абраз Серафіма Сароўскага. Яшчэ адзін абраз прывезлі з Мінска. Іх адрэстаўравалі, зрабілі прыгожыя аклады.

— Усе хочуць, каб манастыр адрадзіўся і каб сюды ўрэшце вярнуўся цудатворны абраз Баркалабаўскай Божай Маці, — гаворыць схіігумення Антонія. — Гэта так і будзе!

Ілона ІВАНОВА.
Быхаўскі раён.

Пад рукамі ўпартай капальніцы праступаюць старажытныя скляпенні.

Мірны атам

Губернатар Смаленскай вобласці Сяргей АНТУФ'ЕЎ:

«БЕЛАРУСАМ ТРЭБА ПЕРААДОЛЕЦЬ ПСІХАЛАГІЧНЫ БАР'ЕР»

Сёння па статыстыцы на аднаго жыхара Смаленскай вобласці прыпадае 20 тысяч кВт-гадзін электраэнергіі ў год, пры тым што ў сярэднім па Расійскай Федэрацыі гэты паказчык не перавышае 5 тысяч кВт-гадзін. Такіх высокіх лічбаў вобласць дасягнула дзякуючы рабоце Смаленскай атамнай электрастанцыі.

Смаленская АЭС — адно з вядучых энергетычных прадпрыемстваў Паўночна-Заходняга рэгіёна Расіі. Штогод яна выдае ў энергасістэму РФ каля 20 млрд кВт-гадзін электрычнай энергіі. Гэта прыкладна сёмая частка ўсёй электраэнергіі, што выпрацоўваецца дзесяццю атамнымі станцыямі Расіі. Смаленская АЭС — найбуйнейшае горадаўтваральнае прадпрыемства вобласці, на долю якога прыходзіцца больш за 30 працэнтаў паступленняў у абласны бюджэт.

— Пасля таго, як у 1982 годзе быў уведзены ў эксплуатацыю першы блок Смаленскай АЭС, наша вобласць атрымала магутны стымул да эканамічнага развіцця, павысіла свой статус, стала рэгіёнам з сур'ёзным індустрыяльным патэнцыялам, — расказаў беларускім журналістам **губернатар Смаленскай вобласці Сяргей АНТУФ'ЕЎ** на прэс-канферэнцыі, што прайшла ў межах прэс-тура саюзных СМІ па перайманні вопыту будаўніцтва і эксплуатацыі атамных электрастанцый. — Цяпер агульная магутнасць САЭС — 3000 МВт. Дзякуючы ўводу яе ў строй, забяспечанасць вобласці электраэнергіяй у тры разы перавысіла яе патрэбы.

Паводле слоў губернатара, атамная электрастанцыя — сур'ёзны эканамічны капітал і адначасова — своеасаблівы інкубатар таленавітых людзей, прафесіяналаў вышэйшай кваліфікацыі.

За больш чым 20-гадовы працоўны стаж Смаленская АЭС прадэманстравала надзейнасць сваіх рэактараў. Па тэхніка-эканамічных паказчыках, радыяцыйнай бяспецы, ступені ўздзеяння на навакольнае асяроддзе яна неаднаразова прызнавалася адной з лепшых атамных станцый Расіі. За ўвесь час эксплуатацыі радыяцыйны фон на пляцоўцы размяшчэння станцыі і ў канталюемай 30-кіламетровай зоне не павышаўся і цяпер знаходзіцца на ўзроўні натуральнага фону (0,09—0,13 мкЗв/гадзіну). Як падкрэсліў Смаленскі губернатар, САЭС — экалагічна чыстае прадпрыемства, якое не аказвае шкоднага ўздзеяння на людзей і асяроддзе.

Асаблівая ўвага тут надаецца мерам бяспекі. Усе тры энергаблокі станцыі абсталяваны сістэмай лакалізацыі аварый, якая выключае выкіды радыеактыўных рэчываў. Спецыяльныя сістэмы забяспечваюць надзейны адвод цяпла ад рэактараў нават пры поўнай страце станцыяй электразабеспячэння з улікам магчымых непаладак абсталявання. Абарона ад радыеактыўнага ўздзеяння пабудавана па прынцыпе паслядоўных бар'ераў, спраўнасць і стан якіх кантралююцца аўтаматычнымі сістэмамі кантролю і персаналам станцыі.

Сёння Смаленская атамная станцыя лічыцца адной з самых надзейных не толькі на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, але і Еўропы, падкрэсліў губернатар. На яго думку, у многім гэта абумоўлена высокай кваліфікацыяй персаналу станцыі. Нездарма менавіта на Смаленскай АЭС у свой час быў створаны першы трэніровачна-вучэбны цэнтр для падрыхтоўкі персаналу ўсіх расійскіх атамных электрастанцый (сёння кожная АЭС мае свой вучэбны цэнтр).

Жыхары населеных пунктаў, размешчаных у 30-кіламетровай зоне вакол станцыі, у тым ліку і горада-спадарожніка САЭС Дзяснагорска, маюць 50-працэнтныя льготы на аплату электраэнергіі. Паводле слоў Сяргея Антуф'ева, многія заходнія краіны ўжо адмовіліся ад такіх прэферэнцый і ад самога паняцця 30-кіламетровай зоны бяспекі.

— Мы перастрахоўваемся, бо ў свой час нас усіх напалохаў Чарнобыль, — патлумачыў кіраўнік адміністрацыі Смаленскай вобласці. Пры гэтым ён заўважыў, што ў жыхароў Смаленскага рэгіёна ў цэлым і ў дзеснагорцаў у прыватнасці няма той радыяфобіі, якая ўсё яшчэ пануе ў Беларусі пасля аварыі на ЧАЭС:

— Для беларусаў, калі вы збіраецеся ўзводзіць сваю АЭС, вельмі важна пераадолець псіхалагічны бар'ер. А для гэтага трэба адпаведным чынам падрыхтаваць грамадскую свядомасць. Многія страхі з'яўляюцца ад недахопу інфармацыі. Калі інфармацыі нестае — яе нішу запаўняюць чуткі.

На Смаленскай АЭС сёння эксплуатуюцца тры энергаблокі з уран-графітавымі рэактарамі РБМК-1000 (рэактар вялікай магутнасці канальны) на цеплавых нейтронах другога і трэцяга пакаленняў. Электрычная магутнасць кожнага — 1000 МВт, цеплавая — 3200 МВт. Праектная гадавая выпрацоўка электраэнергіі САЭС — 21 млрд кВт-гадзін. Спажыванне на ўласныя патрэбы не перавышае 8,5 працэнта ад усёй вырабляемай электраэнергіі.

Першы энергаблок САЭС быў уведзены ў 1982 годзе (праектны тэрмін заканчэння яго эксплуатацыі — 2012 год), другі — у 1985-м (праектны тэрмін заканчэння эксплуатацыі 2015 год), трэці — ў 1990-м (тэрмін заканчэння эксплуатацыі — 2020 год). Для падаўжэння работы Смаленскай АЭС на станцыі рэгулярна праводзяцца планавыя і бягучыя рамонты па рэканструкцыі і мадэрнізацыі абсталявання. Аднак урадам Расіі даўно прынята рашэнне аб будаўніцтве другой атамнай станцыі на тэрыторыі Смаленскай вобласці. Гэты праект уключаны ў расійскую праграму развіцця атамнай энергетыкі. Увод у эксплуатацыю САЭС-2 плануецца пасля 2010 года. Размяшчацца яна будзе за 6 км ад дзеючай станцыі ля вёскі Пяцідворка. Тып энергаблока ўдакладніцца па выніках тэхніка-эканамічнага абгрунтавання.

Як патлумачыў беларускім гасцям **намеснік галоўнага інжынера САЭС па эксплуатацыі Уладзімір ЗАХАРАНКАЎ,** праектам атамных станцый з рэактарам тыпу РБМК (у тым ліку і Смаленскай) прадугледжваецца доўгатэрміновае захоўванне адпрацаванага ядзернага паліва на пляцоўках АЭС. На некалькі гадоў яно змяшчаецца ў басейнах вытрымкі пры рэактарах. Пры гэтым адбываецца істотны спад рэшткавага цеплавыдзялення і актыўнасці. Потым адпрацаванае ядзернае паліва перавозіцца ў спецыяльнае сховішча, дзе захоўваецца ў спецпеналах пад слоем вады 35-40 гадоў. Пасля гэтага тэрміну плануецца перавод адпрацаванага паліва на сухое захоўванне ў Цэнтралізаванае сховішча, якое цяпер будуецца ў Краснаярскім краі. Што датычыцца радыеактыўных адходаў, якія ўтвараюцца пры эксплуатацыі атамных рэактараў любых тыпаў, усе яны збіраюцца, сартуюцца, перапрацоўваюцца і адвозяцца на спецсховішчы.

На Смаленскай АЭС сёння працуе каля пяці тысяч чалавек, чвэрць з якіх — моладзь. Сістэма сацыяльных ільгот і гарантый грунтуецца на карпаратыўным і галіновым пагадненнях, на калектыўным дагаворы. Яна рэалізуецца праз медыцынскае абслугоўванне, добраахвотнае страхаванне і страхаванне ад нячасных выпадкаў ў быце і на вытворчасці, праз рэабілітацыю і сацыяльна-курортнае забеспячэнне, недзяржаўнае пенсійнае забеспячэнне і жыллёвую праграму. Калектыўны дагавор прадугледжвае дадатковыя льготы і гарантыі работнікам САЭС і членам іх сем'яў.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь доля імпартуемых энергарэсурсаў складае каля 85 працэнтаў. Практычна ўвесь газ, што спажываецца ў краіне, а таксама большая частка нафты ўвозяцца з Расіі. Будаўніцтва ўласнай атамнай электрастанцыі дазволіць знізіць залежнасць ад імпарту энергарэсурсаў і забяспечыць краіну адносна таннай энергіяй. Паводле разлікаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, увядзенне ў энергабаланс АЭС сумарнай электрычнай магутнасцю 2 тыс. МВт дазволіць задаволіць каля 25 працэнтаў патрэбаў краіны ў электраэнергіі і прывядзе да зніжэння яе сабекошту на 13 працэнтаў за кошт скарачэння затрат на паліва.

Інга МІНДАЛЁВА.
Мінск — Смаленск — Дзеснагорск — Мінск.

МАЙСТРЫ ЁСЦЬ СПРАВЫ ЛЮБЯЦЬ ЦЯЖКАЕ

ЗАТ «Будпраект» сустракае 40-годдзе ў выдатнай творчай форме, з вялікімі планамі на будучыню

Дынамічнае сацыяльна-эканамічнае развіццё — без усялякага перабольшання, сапраўдная адметнасць дня сённяшняга. Прычым датычыцца гэта ўсяго народнагаспадарчага комплексу краіны, які з года ў год паступальна нарошчвае вытворчыя паказчыкі. Такі заўважны рух наперад стаў магчымым у выніку эладжанай працы многіх айчынных прадпрыемстваў, якія ў цяжкія часы здолелі не толькі ўтрымацца, але і стабільна трывалую аснову для актыўнага развіцця.

Айчынная эканоміка на ўздыме — такую ацэнку цяперашняй сітуацыі можна пачуць ад многіх спецыялістаў. Гэта той фактар, які вызначае ў лепшы бок нашу дзяржаву на постсавецкай прасторы. Адпаведная сітуацыя з'явілася і ў галіне будаўніцтва, якая відавочна не абмінула і зямлякоў з вялікім аб'ёмам работ. Пакольку необходна было абслугоўваць патрэбы нашае не вялікага горада і бліжэйшага рэгіёна, а ў ЧФ Мінскай вобласці. Менавіта над такую глабальную задачу ў 1968 годзе і была створана праектна-канструктарская майстэрня Мінскага аблсельбуда. Адразу прадпрыемства дадавала плошчы — размяшчалася ў падвальным памяшканні. Плошчы, якія займалі, былі невялікія — каля 200 квадратных метраў, працоўны калектыў складаўся з 20 чалавек. Такі атрымаўся пачатак слаўнага шляху.

На працягу шэрагу наступных гадоў прадпрыемства колькі разоў мяняла свае падпарадкаванне, ужываючы ў сваёй назве розныя прывабныя выгляд.

Усе адзначаныя работы пачынаюцца з карпатлівай, творчай, прафесійнай працы праекціроўшчыкаў. Ні для каго, напэўна, не сакрэт, што ўся будучыня прагназаванасці з'яўляецца меназітва з-пад іх лёгкай рукі. Ад удалага праекта напаражую залежыць, якім будзе той ці іншы аб'ект. Гэта вельмі адказная і складаная праца, таксама спецыялісты заўсёды ў цане. Таму попыт на высокапрафесійных праекціроўшчыкаў даволі вялікі.

Заўсёды цікава было пабачыць, як нараджаецца ідэя стварэння будынка, як яна атрымлівае «пуцёўку ў жыццё», а пасля ўвасабляецца ў выглядзе канкрэтнага аб'екта. Гэты працэс надзвычай дапаможны, ў ім важныя падобны на з'яўленне на свет чалавека. Для таго, каб спасцігнуць усе тонкасці такой работы, мы і накіраваліся ў Мар'інагорку, ўзважаючы, без рэзкіх рыўкоў і сацыяльных узрушэнняў. Такая стратэгія ўжо цалкам прыносіць бачны вынік: на ўсіх асноўных пакаўках (як інтэрэсаваных, так і прыватных, уяўных у разрозе асобных прадпрыемстваў), здабывацца ўпэўненых рух наперад.

Гэта факт відавочны, прызнаны шматлікімі ўпльвовымі экспертамі. Ці не галоўны «плюс», які адзначаюць усе, без перабольшання, спецыялісты, — нашай дзяржаве ўдалося не толькі захаваць свой вялізны навыкова-вытворчы патэнцыял (многія дзяржавы былога Савецкага Саюза яго проста страцілі і адразу трапілі «пад уплыў» больш развітых замежных дзяржаў), але і значна яго памнажыць. І датычыцца гэта самых розных галін народнагаспадарчага комплексу Беларусі — ад сельскай гаспадаркі да прамысловасці, ад гандлю да самых сучасных вытворчасцяў.

Напэўна, яшчэ адзін фактар, які вызначае сённяшнюю сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай дзяржавы, — актыўная мадэрнізацыя шэрагу прадпрыемстваў, дзякуючы чаму айчынныя вытворцы на роўных канкуруюць з замежнымі калегамі. А правільна зарыентавацца ва ўмовах рынку — справа надзвычай непростая. Адкуп у рэальным сектары эканомікі ўпогуле быў абраны правільны «вектар» развіцця, таму і справы тут паразмаўляць. Іншым словамі, нават улічваючы шэраг цяжкасцяў, з якімі сутыкаліся і сутыкаюцца айчынныя вытворцы, эканамічны механізм працуе эладжана і рытмічна.

Бадай, найбольш відавочным адлюстраваннем тых станоўчых працэсаў, якія адбываюцца ў айчыннай эканоміцы, з'яўляецца сапраўды будаўнічы «бум». Прычым гэта датычыцца не толькі ўзвядзення жылых дамоў, але і самых разнастайных аб'ектаў сацыяльнай, культурнай сфер. З'яўляюцца прыгожыя адміністрацыйныя будынкі дарогі, необходная інфраструктура. Адбываецца маштабная рэканструкцыя, рамонт жыллёвагу і многіх важных аб'ектаў. Даводзяцца да

канчанне. Уваішлі ў Белсельбуд, а пасля ў праектна-пошукавы інстытут па сельскім будаўніцтве «Мінсксельбудпраект». Гэта быў 1984 год. А ў 1987-м прадпрыемства пачало ўзводзіць уласны будынак. Прыкладна праз тры гады сямідзесяровая адміністрацыйны корпус быў здадзены ў эксплуатацыю. У пачатку 1990-х насталі сапраўды вельмі цяжкія часы — праектный інстытут не зніклі адзін за адным. Утрымацца было надзвычай складана. Вось і «Мінсксельбудпраект» вырашыў адмежавацца ад свайго маладзенскага філіяла. Адпаведны ўказ кіраўніка філіяла. Адпаведны ўказ кіраўніка філіяла. Адпаведны ўказ кіраўніка

Для абуладкавання на магістралі прыпынку не хапае пасажырапатоку

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

70-гадовай жыхарцы вёскі Устрань Слуцкага раёне Валянціне Сцяпанаўне Жыгмянтовіч, паводле яе слоў, штомесяц даводзіцца выпраўляцца ў дарогу ва ўчастковую бальніцу: трэба выпісваць рэцэпты для мужа-інваліда. Усё б нічога, дык вось толькі сам шлях...

— Каб сесці на аўтобус «Слуцк — Балочыцы», які ідзе праз вёску Белічы, да апошняй трэба ісці недзе 4 кіламетры. У саміх Белічах аўтобусны прыпынак ёсць, але мы выходзім да дарогі фактычна з поля і ўжо тут спрабуем або «злавіць» спадарожную машыну, або спыніць памянёны аўтобус, — тлумачыла заяўніца. — У апошні раз ён не спыніўся, дык давялося прайсці яшчэ кіламетры два да Навабелічаў, прагаласаваць там і ўжо на спадарожнай машыне праехаць яшчэ столькі ж да бальніцы. Назад, дарэчы, вярталася на тым самым аўтобусе, спытала ў вадзіцеля, чаму, маўляў, не спыніўся раніцай. Адказаў, што нельга, няма афіцыйнага прыпынку. Дык чаму яго не зробяць? Мы ўжо і раней прасілі. У нашай Устрані жывуць чалавек 20, большасць час ад часу мае патрэбу некуды з'ездзіць, вось мне — у бальніцу тую ж...

Як патлумачылі нам у даччыным унітарным прадпрыемстве «Аўтобусны парк № 2 г. Слуцка», які ўласна і абслугоўвае прыгарадны маршрут «Слуцк — Балочыцы», гаворка ідзе пра магістраль Мінск — Мікашэвічы. Афіцыйнага прыпынку побач з Белічамі сапраўды няма, няма яго і ў пашпарце маршрута, таму вадзіцель аўтобуса нічога не парушыў, калі не спыніўся: забаронена ў мэтах бяспекі.

— Калі б гаворка ішла пра нейкую другасную дарогу, па запатрабаванні пасажыраў яшчэ можна было б неяк спыняцца, але не на магістралі, — патлумачыў выконваючы абавязкі дырэктара аўтобуснага парка Леанід Шыманскі.

Далей суразмоўца пацвердзіў, што пытанне абуладкавання тут прыпыначнага пункту ўзнімалася і раней жыхарамі некаторых навакольных вёсак. Але яно знаходзіцца ў кампетэнцыі дарожнікаў — ДЭУ-64 у прыватнасці. Аўтобусны парк мог толькі правесці вывучэнне пасажырапатоку з мэтай высвятлення сітуацыі: сапраўды патрэбны прыпынак ці не. І такая работа была праведзена з 13 па 26 жніўня 2007 года.

— Як вынік: 17 жніўня ў дадзеным месцы выйшаў адзін чалавек... Безумоўна, мы і цяпер маглі б зноў правесці вывучэнне пасажырапатоку, але не думаю, што ён нашмат павялічыўся. Да таго ж абуладкаванне дарожнікамі прыпынку будзе каштаваць нямала, бо ён павінен адпавядаць патрэбным стандартам. Гэта ж магістраль, а не грунтовая дарога, дзе можна было абысціся толькі падсыпкай месца. Ці пойдуць яны на гэта? — патлумачыў Леанід Мікалаевіч.

Далей ён дадаў, што недзе за 250 метраў ад таго месца, дзе заяўнікі патрабуюць абуладкавання прыпынку, ужо ёсць афіцыйны аўтобусны прыпынак. Размешчаны ён праз 50 метраў далей на з'ездзе з трасы і там памянёны аўтобус «Слуцк — Балочыцы» спыняецца...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кватэрнае пытанне

Калі месца насамрэч хапае...

Мае бацькі жывуць у вёсцы. Хатка невялікая, старая і ўсіх гасцей размясціць там бывае цяжка. Асабліва летам. Вось мы і падумалі: а што, калі побач з бацькоўскім домам паставіць яшчэ адзін? Зямлі, як быццам, хапае — 25 сотак. Жаданне і сілы ёсць... Але ж ці ёсць закон, які дазваляе нам гэта зрабіць?

Г.Ф. Пяткевіч, *г. Мінск.*

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, на зямельным участку, які знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, можа быць пабудаваны яшчэ адзін індывідуальны жылы дом, калі гэты ўчастак можа быць падзелены на два самастойныя, якія захаваюць мэтавае прызначэнне (будаўніцтва і абслугоўванне жылога дома) і пры гэтым не будуць парушацца проціпажарныя, санітарныя, экалагічныя, будаўнічыя і іншыя нормы і правілы.

Парадак дзялення (падзелу) зямельных участкаў, якія знаходзяцца ва ўласнасці, вызначаны Інструкцыяй, зацверджанай пастановай Камітэта па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 сакавіка 2004 г. № 6.

Такім чынам, пасля падзелу зямельнага ўчастка на два самастойныя, свабодны ад забудовы зямельны ўчастак можа быць падораны бацькамі сваім дзецям для ажыццяўлення ва ўстаноўленым парадку будаўніцтва індывідуальнага жылога дома. Здзелкі па адчужэнні зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, ажыццяўляюцца ў пісьмовай форме, натарыяльна сведчацца і рэгіструюцца спецыяльна ўпаўнаважаным дзяржаўным органам па зямельных рэсурсах і землеўпарадкаванні па месцы знаходжання зямельных участкаў.

Неабходна таксама адзначыць, што ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 лютага 2006 г. № 87 «Аб некаторых мерах па скарачэнні незавершаных будаўніцтвам незакансерваваных жылых дамоў, дач» будаўніцтва капітальных збудаванняў у выглядзе жылога дома на зямельным участку, які прадастаўлены ва ўстаноўленым парадку пасля ўступлення ў сілу Указа (з 1 красавіка 2006 г.) павінна быць завершана грамадзянінам на працягу трох гадоў з даты атрымання дазволу на будаўніцтва, выдадзенага мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, але не пазней чым праз 3,5 года з даты атрымання дакумента, які сведчыць дзяржаўную рэгістрацыю права прыватнай уласнасці на такі зямельны ўчастак.

Віктар САВІЦКІ.

НА КРУГІ СВАЕ

Юрый Мароз, пабыўшы на пасадзе міністра сельскай гаспадаркі, пакінуў сталіцу і адправіўся ў пасёлак Белавежскі, а гэта 400 км ад Мінска. Там ён узначаліў жывёлагадоўчы комплекс і вось што з гэтага атрымалася.

Генеральны дырэктар ААТ «Белавежскі» Юрый МАРОЗ:

— На пачатку дзевяностых гадоў, калі пачалася вядомая нам палітычна-эканамічная нестабільнасць, на абласным узроўні мне гаварылі: «Юра, кідай ты ўсё і ўцякай, а то пасадзяць». Цяжкія часы былі, але комплекс удалося захаваць, і калі ў 1996 годзе я пайшоў на новую працу, то быў упэўнены, што нікому не ўдасца комплекс разваліць і за дзесяць гадоў. Сістэма ўпраўлення адладжаная, у прадпрыемства ніякіх даўгоў і крэдытаў. Але я памыліўся.

Мне давялося пабываць у «Белавежскім», калі Ю. Мароз комплекс ужо пакінуў і сітуацыя там склалася напружаная — не хапала кармоў. Падзеж быў высокім і ў асноўным гінуў маладняк. На забой адпраўлялі свіней, якія не здолелі набраць і 70 кг.

— У 2002 годзе вырашаўся мой далейшы лёс, і калі я аднойчы паведаміў жонцы, што давядзецца ехаць назад у «Белавежскі», то яна паглядзела выразна і сказала, што з галавой у мяне не ўсё ў парадку. Вядома ж, сталіца, жыццё наладжана, а тут назад... Прыехалі ў «Белавежскі» і нават выкупілі свой дом, які прадалі перад ад'ездам у Мінск.

Калі развал, то не ведаеш, за што брацца. Але найперш неабходна было спыніць падзеж жывёлы — справіцца з хваробамі свіней. Прыйшлося звярнуцца да палякаў. Іх спецыялісты ўсё раскласці па паліцах і сказалі, што трэба рабіць. А ўвогуле, найлепшая вакцына — гэта якасны корм з усімі неабходнымі дабаўкамі. І праз тры гады абстаноўка на комплексе нармалізавалася. Адыграла ролю і тое, што мы пачалі браць зямлю ў вялікіх аб'ёмах, да комплексу далучылі 4 калгасы, вядома ж, не лепшыя. Калі мы ўзялі апошні, то там заробак у 2003 годзе быў 36 тысяч ды і тую зарплату не выдавалі людзям паўгода. На фермах ні вокнаў, ні дзвярэй. Многія не разумелі тады — навошта ўсё гэта? Але з'явілася свая зямля, а з ёю і корм. Удалым аказаўся 2004 год, які даў па 46 ц/га збожжа. А сёння ў нас 14 тысяч гектараў і комплекс на 90 працэнтаў забяспечаны сваімі кармамі.

Юрый МАРОЗ.

Адназначна, што, папрацаваўшы міністрам, Юрый Мароз ведаў, дзе ўзяць грошы, і ў гэтым плане яму ішлі насустрач. Істотна дапамог Нацыянальны банк. Да 2002 года ў «Белавежскага» набралася 18 млрд даўгоў, толькі прыватнікам была запазычанасць у 2,5 млн долараў. «Беларусбанк» выкупіў усе крэдыты і да сёлетняга года комплексу было прадастаўлена ільготнае крэдытаванне пад 3 працэнты. Без такой падтрымкі выбрацца з даўгоў самастойна было б праблематычна.

— Пяць гадоў таму выпуск мяса на комплексе быў у межах сямі тысяч тон, найбольшай вытворчасці мяса дасягнулі ў 1987 годзе —12 тыс. тон, а сёлета мы выходзім на 15 тыс. тон, рэнтабельнасць свініны — 20 працэнтаў. Дойных кароў у нас 1850 галоў і надоі ў межах 6400 кг ад каровы, рэнтабельнасць малака 50 працэнтаў. Больш паловы мяса мы перапрацоўваем самі, а 35 працэнтаў адпраўляем на экспарт. Ёсць свае магазіны ў Мінску і па Брэсцкай вобласці. За 9 месяцаў атрымалі 12 млрд. прыбытку. На «Белавежскім» працуе 1420 чалавек, сярэдняя зарплата па прадпрыемству 821 тысяча. Сёння ў нас няма пратэрмінаванай аплаты крэдытаў, выплачваем падаткі...

З прыходам у «Белавежскі» Ю. Мароза вытворчасць мяса, як мы бачым, выраслa ў 2,2 разa, а вось выкарыстанне газу зменшылася ў 10 разоў. У гэтым плане на комплексе праведзена поўная рэканструкцыя, і калі тэмпература паветра да -5°С, то выкарыстоўваецца мясцовае паліва, а пры больш нізкай тэмпературы апальванне ідзе газам. Самы выгадны збыт мяса — гэта экспарт. «Белавежскі» нават меў два магазіны ў Маскве, але давялося іх закрыць, бо пачаліся перабоі з пастаўкай мяса туды, і не па віне «Белавежскага». Перашкаджае празмернае адміністраванне, нашы бюракратычныя перапоны.

— Зямля ў нас не з лепшых — многа каменя, і каб сабраць з гектара, як у гэтым годзе, 55 цэнтнераў, то неабходна ў зямлю і многа ўкласці. І калі б не фонд падтрымкі сельскай гаспадаркі, то мы не здолелі б столькі купляць мінеральных угнаенняў, прэпаратаў аховы раслін... А з праблемай каменя таксама спраўляемся. У нас знаходзіцца спецкамендатура, і 150 чалавек асуджаных да «хіміі» штодня выходзяць на поле збіраць каменне. Працуюць добра, бо без нашага хадайніцтва нікога датэрмінова не вызваляюць. А на «хіміі» ў асноўным сядзяць за нявыплачаныя аліменты ды вадзіцелі, якія ўчынілі дарожныя аўтааварыі. Некаторыя пасля вызвалення застаюцца ў нас працаваць.

— Навошта мне шукаць недзе работу, калі ў вас зарабіць можна, — кажа чалавек, і мы ідзём насустрач.

Цікава, але з 2002 года генеральны дырэктар не змяніў ніводнага спецыяліста, а гэта з'ява даволі рэдкая: кожны кіраўнік імкнецца падабрацъ сваю каманду, якая найбольш падыходзіць яму. Але не трэба думаць, што Ю. Мароз такі добры і пакладзісты. Ён выслухае ўсе прапановы і прымае рашэнне — апошняе слова за ім. Лічыць, што чалавеку неабходна даць магчымасць праявіць сябе, а з кадравымі перастаноўкамі не трэба спяшацца. Іншая справа — падказаць, направіць... Ды людзі пры такой зарплаце стараюцца не аступіцца. Тут якраз той выпадак у сельскай гаспадарцы, калі добры заробак адпавядае добраму жыллю з выгодамі.

— Калі толькі была задума ўзвесці гэты пасёлак, то Уладзімір Бядуля, пачуўшы пра мае планы, сказаў: «Ты, малады чалавек, напэўна, музыкант. Табе як тыя клавішы — націсnуў і ўсё будзе. Я вунь ужо трыццаць гадоў як нагой дзверы ў любы кабінет адчыняю і ведаю, што да чаго». Уладзімір Лявонцьевіч чалавек аўтарытэтны і з двойчы Героем не выпадала спрачацца, а сёння наш пасёлак можа канкураваць з іншым райцэнтрам. Адзін Палац культуры чаго варты! Жыццё не саступае гарадскому.

У «Белавежскім» рабочыя кароў не трымаюць, хоць больш дробную жывёлу і птушак у некаторых дварах гадуюць. Магчыма, тут чалавеку лепш чым у горадзе, бо акрамя зарплаты рабочыя атрымліваюць бясплатныя абеды ды яшчэ па 3-15 кг мяса — натуральная даплата.

Пра ААТ «Белавежскі» яшчэ многа можна было б расказваць. Напрыклад, што тут не ўзводзілі новых фермаў, а прывялі ў парадак тыя, што былі, гэтаксама паступілі і з мехдварамі. Што на прадпрыемстве перавага аддаецца сучаснай замежнай тэхніцы, што ў перспектыве ўзвядзенне сучаснага камбікормавага завода (яшчэ аднаго), спартыўнага комплексу... Але, напэўна ж, ёсць і праблемы.

— Галоўная праблема звязаная з фарміраваннем цэнаў у сельскай гаспадарцы, а яшчэ адна ў тым, што ў кіраўніцтва і калектыву няма зацікаўленасці ў рабоце. Здавалася б, чым больш прадукцыі выпускаем, тым больш высокай павінна быць зарплата, а на справе гэтага няма. Ды і іншыя праблемы ўзнікаюць.

Засталося толькі сказаць,ы што ААТ «Белавежскі» — прадпрыемства паказальнае. Са 106 жывёлагадоўчых камплектаў краіны ён з'яўляецца адным з лідараў, а гэта абавязвае да многага.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Камянецкі раён.

Фота аўтара.

Палац культуры.

ПА ЯКІМ РАСКЛАДЗЕ ПОЙДУЦЬ ЦЯГНІКІ?

Падчас святочных дзён змяненні ў раскладзе руху будуць датычацца і прыгарадных цягнікоў. У прыватнасці, 6 лістапада на ўчастках Мінск — Асіповічы, Мінск — Орша, Мінск — Баранавічы і Мінск — Маладзечна яны будуць курсіраваць згодна з раскладам пятніцы, 7 і 8 лістапада — суботы, 9 лістапада — нядзелі. На Маладзечанскім вузле 7 і 8 лістапада будзе дзейнічаць расклад суботы, 9 лістапада — нядзелі. На ўчастку Орша — Лепель 7, 8 і 9 лістапада прыгарадныя цягнікі будуць курсіраваць у адпаведнасці з раскладам выхадных дзён.

Сяргей РАСОЛЬКА.

І ТЫСЯЧАРУБЛЁЎКА ЎЖО ФАЛЬШЫВІЦЬ...

Пры падліку выручкі сельскага Дома культуры Кармянскага раёна падазрэнне выклікала купюра вартасцю ў адну тысячу рублёў, пасля чаго пачаліся аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы мясцовай міліцыі. Выявілася, што купюру на прынтары вырабіў 20-гадовы хлопец, які вырашыў праверыць якасць друку. З той мэтай, каб у далейшым пачаць штампаваць іх, калі ўсё сыдзе, як гаворыцца, з рук. Гэта ж, маўляў, не «пяцідзесяцірублёўкі» ці «сотні», да якіх пільнасць праяўляюць. Зламыснік перадаў тую купюру свайму маладзейшаму сябру і той, ведаючы аб падробцы, пашыбаваў у клуб. Танцы ў яго закончыліся паспяхова, а вось зараз хлопцы «ў тэмпе лявоніхі» круцяць мазгамі, каб пазбегнуць пакарання за свае неабдуманыя дзеянні.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Открытое акционерное общество «ДСТ № 2, г. Гомель»

СООБЩАЕТ

о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 17 ноября 2008 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж, конференц-зал.

Повестка дня:

1. О продаже на аукционе неиспользуемых объектов недвижимости.

2. Об оказании безвозмездной финансовой помощи.

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

УНН 400022426

У суд **Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым грамадзяніна **ЛІСТРАЦЕНКІ Мікалая Сямёнавіча**, 1954 года нараджэння, ураджэнца вёскі Сялецкае Касцюковіцкага раёна, які пражываў па адрасе: Касцюковіцкі раён, в. Сялецкае, д. 1, кв. 13, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання: 2003 год — в. Сялецкае Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Лістраценку Мікалая Сямёнавіча, паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПІКНІК ДЛЯ ВЕПРУКА

Вёска Хракавічы знаходзіцца за сорак кіламетраў ад Чарнобыльскай станцыі. Са скаргай на занадта пражэрлівых дзікоў яе жыхары сёлета звярнуліся да мясцовых уладаў. Пішуць: прыходзяць зверы на людскія агароды, выбіраюць, што ім даспадобы, і ласуюцца. Аналагічныя звароты на імя старшыні Брагінскага райвыканкама адрасавалі жыхары вёсак Просмычы і Новая Грэбля.

Старшыня Хракавіцкага сельскага Савета Адам Царанок — сам заўзяты паляўнічы. Аднак, гаворыць, такіх, як ён, аматараў становіцца ўсё менш: «Цяпер у раёне 70 паляўнічых, а было калісьці 350». На пытанне, куды ж дзеліся сапраўдныя мужчыны, адказвае, што не таннае гэта задавальненне для вяскоўца. Узносы членскія вялікія — каля 100 тысяч, пуцёўка каштуе 80 тысяч рублёў, раз на тры гады дзяржпошліна на зброю — яшчэ 100 тысяч. Разавы дазвол на здабычу дзікай жывёліны — ад 40 тысяч за сяголетка да 230 — за трафейнага дзіка. А калі што парушыў — штрафы завоблачныя. Праўда, час ад часу і сюды наязджаюць аматары з іншых гарадоў, у тым ліку з расійскай сталіцы. Ёсць адзін італьянец, які штогод імкнецца да блізкасці з прыродай менавіта на ўгоддзях мясцовай паляўнічай гаспадаркі.

Забаўка не для бедных

А ці ведаеце вы, што клыкі даўжынёй звыш 28 сантыметраў каштуюць 2600 еўра? А менш за 13 сантыметраў — 250 еўра. Размова ідзе аб трафейным дзіку, забітым на паляванні. Самца кабана ў пяці-сямігадовым узросце называюць секачом — за загнутыя клыкі, якімі ён здольны секчы праціўніка. Забіць такога — асабліvы гонар для паляўнічага і таму такія каштоўныя трафеі. Але ж каб атрымаць своеасаблівы сувенір за такія немалыя грошы, трэба ехаць у расійскае Прымор'е. Гэтую і іншую інфармацыю ў вялікай колькасці можна знайсці на рэкламных сайтах, прысвечаных паляванню на дзіка ў розных краінах свету.

Беларусь для паляўнічых у інтэрнэце прадстаўлена невыразна. Пасля доўгіх пошукаў усё ж такі было знойдзена некалькі прапаноў. Вартасць паляўнічага тура ў Віцебскай вобласці каштуе 130 еўра ў дзень. У яе ўваходзяць суправаджэнне егерам, транспартныя паслугі, ліцэнзія на паляванне, прадастаўленне трафейнага ліста, пражыванне і харчаванне падчас палявання. Дадаткова аплачваюцца сустрэча і провады на мяжы, дазвол на ўвоз і вываз адной адзінкі зброі і боепрыпасаў да яе (50 еўра), ветэрынарны сертыфікат (40 еўра), кошт трафеяў і іншыя паслугі. Для замежных грамадзян дзік з клыкамі 13 см будзе каштаваць менш за 200 еўра. Здаецца, Беларусь проста павінна прыцягваць паляўнічых усіх краін. І танна, і востpых пачуццяў — звыш меры.

Кабаны суседніх краін, аб'ядноўвайцеся!

Праўда, востpых пачуццяў дастаткова і ў жыхароў тых раёнаў, дзе за апошнія гады распладзіліся дзікі. У Брагінскім раёне, які гранічыць з Палескім радыялагічным запаведнікам, жывёла час ад часу выходзіць харчавацца на палеткі. Асабліва шанує кукурузу малочна-васковай спеласці. Пасля раннягa снедання або начной вячэры поле падобнае на толькі што пераворанае, але ж бульдозерам, — сведчаць людзі. І прапануюць радыкальную меру барацьбы: «Пастраляць усіх!»

У Нараўлянскім раёне сёлета спецыяльная камісія двойчы выязджала падлічваць страты на месцах патраў — у гаспадаркі «Братэрства» і «Кіраўскае». Парнакапытныя з'елі пятую частку кукурузы, высаджанай як на зялёную масу, так і на зерне. Асаблівасць поўдня Беларусі не толькі ў блізкасці да «зоны». Пашпартны рэжым, устаноўлены на мяжы з Украінай, на дзікоў не распаўсюджваецца. Тым больш, як расказвае радыёлаг Нараўлянскага раёна Аляксандр Сініцкі, на тэрыторыі суседняй дзяржавы і ў былыя часы сельская гаспадарка не вельмі развівалася, а цяпер зусім завяла. Вось і ходзяць дзікі камандамі па 50—100 галоў карміцца ў Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Між іншым, у гэтым раёне, як і ў Гомельскім і Добрушскім, сёлета ўзялі павышаныя ліміты на адстрэл кабана. Увогуле 90 жывёлін толькі ў Нараўлянскім раёне павінны быць, як сказана ў дакументах, «адабраныя з жывой прыроды». Прасцей кажучы, забітыя.

Дзік у законе

Па афіцыйных звестках Гомельскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання, зараз у вобласці налічваецца амаль 9300 асобін дзіка. Яго колькасць у параўнанні з мінулым годам выраслa на 15 працэнтаў. Пры тым што ў тэорыі прырост можа складаць да 200 працэнтаў! Сённяшні ўзровень толькі на 5—10 працэнтаў перавышае аптымальны, і таму, лічаць эколагі, небяспекі не стварае.

Летась была прынята пастанова Савета Міністраў Беларусі аб магчымасці ўвядзення асаблівага рэжыму выкарыстання рэсурсаў дзікага кабана, які наносіць страты ў асобных раёнах. Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам дадзена права ўводзіць на сваёй тэрыторыі асаблівы рэжым яго адстрэлу. Рэжым можа быць уведзены па прапанове камісіі па папярэджванні знішчэння або пашкоджання паляўнічымі жывёлінамі сельскагаспадарчых і лясных культур, калі дзікі пашкодзілі не менш за чвэрць ад усіх плошчаў пасеваў.

Нядаўна ў Лельчыцкім раёне быў уведзены такі рэжым. Ён, між іншым, прадугледжвае дазвол на паляванне не толькі з прымяненнем паляўнічай агнястрэльнай зброі, але і магчымасць ставіць жывапасткі (гэта такія агароджаныя падкормачныя пляцоўкі, вароты якіх зачыняюцца пасля таго, як туды трапляе жывёліна). Акрамя таго, дазваляецца паляванне прамысловым брыгадам з ліку мясцовых жыхароў і супрацоўнікаў паляўнічых гаспадарак. Пры такім рэжыме можна таксама паляваць ў любы час сутак і за межамі тэрмінаў, дазволеных правіламі. Аднак у Гомельскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя гаворыць, што менавіта ў гэтым, самым лясістым раёне вобласці, колькасць пагалоў'я кабаноў не перавышае аптымальнага ўзроўню. Ці не стаіць за ўвядзеннем падобнага рэжыму бяздзейнічанне раённай камісіі, супрацоўнікаў паляўнічых і сельгаспадарак, непрыняцце элементарных мераў для папярэджвання патраў, жаданне спісаць страты «на вепрука»?

Вядучы паляўніцтвазнаўца Гомельскай абласной арганізацыйнай структуры Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Пётр Голуб расказвае, што паляўнічыя не маюць вялікай ахвоты адстрэльваць дзіка ў так званых «забруджаных зонах» Гомельшчыны. Толькі сёлета мяса 63 адстрэленых жывёл прызнана непрыдатным для ўжывання — яно таксама радыяцыйна забруджанае. Паляўнічым кампенсуюцца выдаткі на ліцэнзію (так звычайна называюць разавы дазвол на здабычу) у выпадку, калі забіты кабан непрыдатны для ежы. Часта мясцовыя жыхары сустракаюцца і з іншай бядой — шаленствам дзікіх жывёл. Той жа паляўнічы з Брагіншчыны Адам Царанок сам летась забіў двух шалёных вепрукоў.

Пры гэтым далёка не ўсе выконваюць Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых мерах па павышэнні эфектыўнасці вядзення паляўнічай гаспадаркі і рыбагаспадарчай дзейнасці, удасканаленні дзяржаўнага кіравання імі», дзе сказана, што «Пры ўстанаўленні заражанасці прадукцыі палявання трыхінелёзам, спаргазам або фінозам ці перавышэння гранічна дапушчальных узроўняў радыяцыйнага забруджвання прадукцыя палявання абясшкоджваецца карыстальнікам паляўнічых угоддзяў у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб адходах». У сапраўднасці мала хто хоча везці тушу забітага хворага або забруджанага на радыяцыю дзіка на ўытыльзавод у Гомельскім раёне. Куды лягчэй закапаць, дзе давядзецца.

Меню для вепрука, або Што не з'еў, то пакусаў

Адстрэльванне дзікіх жывёл — далёка не адзіны спосаб стрымлівання калектыўных і індывідуальных паходаў кабаноў на сельгаспасевы. Гаспадаркі разам з паляўнічымі павінны выконваць шэраг мераў, накіраваных на падтрыманне колькасці дзікоў у пэўных межах — не менш за тры асобіны на тысячу гектараў. Першая з іх — зразумела, не марудзіць з уборкай сельгаскультур. Аб выкананні іншых — у тэорыі і на практыцы.

● Біятэхнічныя мерапрыемствы павінны праводзіць у тых месцах, дзе дзік «сталаваўся» летась. Ён сапраўды памятае, дзе было смачна і прыходзіць праверыць, ці ёсць што на гэты раз.

● На полі трэба абавязкова мяняць культуры, якія прыйшліся даспадобы драпежніку. Нават людзі, далёкія ад сельскай гаспадаркі, ведаюць, што севазварот карысны для глебы — гэтая мера звычайна выконваецца.

● Трэба стварацъ адцягваючыя падкормачныя пляцоўкі. Для гэтага ўсе карыстальнікі паляўнічых гаспадарак закупляюць адходы зерня. Але ж ці ў дастатковай колькасці і якой якасці? Часцей прывозяць на паляўнічыя ўгоддзі тое, што магло б згнісці на асабістым падворку. Кабану такі корм наўрад ці прыходзіцца даспадобы.

● Пасеў буферных зонаў. Гэта калі першыя 50—100 метраў поля засеяныя культурай, якую дзік не любіць. Рэальна такіх культур няма — ён есць усё: ад бульбы да гуркоў і таматаў. У Малдове з задавальненнем частуецца вінаградам, а ў ізраільскім горадзе Хайфа летась паеў амаль усе зялёныя насаджэнні. Вяпрук не грэбуе і мясам, у тым ліку змей, яд якіх, здаецца, на кабаноў не дзейнічае. Агульнавядома, што дзікі знаходзяць пад зямлёй розныя ласункі — карэнне, плады і грыбы.

● Рэкамендавана засейваць узлескі і прагаліны кормам для вепрукоў, напрыклад, аўсом. На практыцы кабан «дзякуй» не гаворыць, аднак з'ядае з задавальненнем. З'еў бы яшчэ — ды дзе ўзяць столькі «аўсяных узлескаў»?

● Звер пужлівы. Баіцца ўсяго, што звязана з чалавекам. Абаронцы прыроды рэкамендуюць выкарыстоўваць супраць нашэсця кабаноў усё, што грукае, напрыклад, петарды. У французскім дэпартаменце Канталь адзін селянін прымяніў незвычайны спосаб абароны свайго бульбянога поля. Па ўскрайку яго ён устанавіў некалькі радыёпрыёмнікаў і ўключыў іх на самую вялікую гучнасць. Першы намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Андрэенка расказвае, што ў шэраг гаспадарак закупілі спецыяльныя гарматы з газавым балонам на вышыні трох метраў. Але ж разумная жывёліна праз некаторы час прыйшла да высновы, што ніякай бяды ад такой «пукалкі» няма і стала пасвіцца пад прыладай. У Петрыкаўскім раёне, дзе знаходзіцца дзяржаўны «Нацыянальны парк «Прыпяцкі», дзе дзікі адчуваюць сябе гаспадарамі, на дрэвах побач з полем развешваюць старое адзенне, якое мае чалавечы пах. На пэўны час дапамагае.

● Прымяненне электраагародж'аў для аховы асабліва каштоўных пасеваў, увогуле самае звычайнае агароджванне ўсяго таго, на што можа спакусіцца нахабны налётчык. Але ж дзе грошы ўзяць на кіламетры частаколу? — разводзяць рукамі вяскоўцы.

Начальнік аддзела дзяржаўнага кантролю за аховай і выкарыстоўваннем зямель, раслiннага і жывёльнага свету, асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Гомельскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Кузьменка гаворыць, што ў іншых краінах, напрыклад у Польшчы, да 50 працэнтаў даходаў паляўнічых гаспадарак ідзе на прадухіленне і выплату страт ад патраў. У нас усё звычайна заканчваецца складаннем актаў. Да суда ніводная справа так і не дайшла. Бо калі пачынаюць разбірацца: хто што павінен быў зрабіць, каб не дапусціць вепрука на палеткі, аказваецца, што ніводны бок да канца не выконвае прадугледжаных заканадаўствам правілаў. А яны гавораць: «Землекарыстальнікам і грамадзянам, якія не забяспечылі выкананне ўскладзеных на іх мерапрыемстваў па прадухіленні патраў, страты, прычыненыя дзікімі капытнымі жывёлінамі, не аплачваюцца». Відаць, таму лягчэй за ўсё прапанаваць самыя радыкальныя меры барацьбы з няпрошанымі гасцямі сельскагаспадарчых угоддзяў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Здание компрессорной с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка	Здание аптеки и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	г. Брест, ул. Мошенского (ст. Брест-Восточный)	Брестская обл., Ганцевичский р-н, д. Чудин, ул. Советская, 33
Продавец недвижимого имущества	ТРУП «Брестское отделение железной дороги», (0162) 27 22 22, 27 28 65, 27 35 70	Брестское ТПРУП «Фармация», (0162) 41 69 50
Характеристика предмета аукциона	Здание компрессорной – кирпичное, 1973 г.п., площадь – 245,8 кв.м, заборы из металлической сетки на металлических столбах и из железобетонных плит, водопроводная сеть. Земельный участок площадью 0,4444 га использовать для размещения объекта промышленной зоны (кроме жилья); срок аренды – 49 лет	Здание аптеки 1971 г.п., площадь – 50,2 кв.м, сарай, уборная, забор. Земельный участок площадью 0,0815 га использовать для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли, услуг, жилья; срок аренды – 55 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	523 590 257	18 467 340
Сумма задатка, руб.	52 359 000	1 846 000
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, 23 44 06, www.brest-region.by*	

Аукцион состоится **9 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНП 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическими лицами – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Индивидуальными предпринимателями – нотариально заверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранными юридическими лицами – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителями иностранных юридических лиц или иностранных граждан, лиц без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

7. Представителями граждан и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь – нотариально заверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь и представители иностранных юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона, внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государ

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з дадзенымі Правіламі ў тэрмін з 4 лістапада 2008 года па 14 студзеня 2009 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда».

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), зарэгістраваная рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 02.08.2001 № 1010 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 100155376, УНП 100155376, месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд Гульні фарміруецца за кошт чыстага прыбытку Арганізатара Гульні і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць	Цана за адзінку (руб.)	Кошт (руб.)	Стаўка ПДВ (%)	Сума ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Майкі чырвоныя з вышыўкай лагатыпа	7 шт.	14819	103733	18	18672	122405
2.	Бейсболкі з лагатыпам і святло-адбівальным флэксам	7 шт.	12506	87542	18	15758	103300
3.	Гадзіннікі настольныя 47017 ЧНС-020390011 (1)ЗВ2	7 шт.	21920	153440	18	27619	181059
4.	Тэлевізар “Віцязь” 21ctv790-3, г. Віцебск	4 шт.	279810	1119240			1119240
5.	Тэлевізар “Віцязь” 54ctv720-3, г. Віцебск	3 шт.	279810	839430			839430
6.	Печ ЗВЧ “Daewoo” KOR-6C07, Кітай	1 шт.	249090	249090			249090
7.	Халадзільнік “Атлант” МХМ 2835-90, г. Мінск	1 шт.	794920	794920			794920

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 3409444 (Тры мільёны чатырыста дзевяць тысяч чатырыста сорак чатыры) беларускія рублі.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ. ПАРАДАК АДБОРУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

4. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першае паўгоддзе або першы квартал 2009 года.

5. Падставай для ўдзелу ў Гульні з’яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпіснай кампаніі на першы квартал 2009 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца да двух разоў у тыдзень у перыяд з 4 лістапада 2008 года па 31 снежня 2008 года ўключна ў газеце «Звязда».

6. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

7. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або якія паступілі ў рэдакцыю пасля 5 студзеня 2009 года па паштовым штэмпелі атрымання да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

8. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) з тэрмінам паўнамоцтваў з 4 лістапада 2008 года па 14 студзеня 2009 года ў складзе пяці чалавек.

9. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца падпісчыкі газеты або прадстаўнікі незалежных арганізацый.

10. Пасяджэнні Камісіі з’яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці з яе зарэгістраванага складу.

11. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з’яўляецца вырашальным.

12. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

13. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 8 студзеня 2009 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

14. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

15. Спачатку разыгрываюцца асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска па адной майцы, адной бейсболцы, адным настольным гадзіннику і па адным тэлевізары «Віцязь».

16. Выйграўшым прыз лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча ўказана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне наўздагад са скрыні хто-небудзь з падпісчыкаў або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка ўказваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

17. Для розыгрышу печы ЗВЧ і халадзільніка ўсе астатнія карткі ўдзельнікаў, па якіх не былі выйграны прызы, змяшчаюцца ў адну скрыню і старанна перамешваюцца.

Вызначэнне выйграўшых удзельнікаў адбываецца ў парадку, устаноўленым пунктам 16 гэтых Правілаў.

18. Удзельнікам, якія выйгралі прыз, Арганізатар да 20 студзеня 2009 года дасылае паведамленне аб гэтым заказным пісьмом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

19. Умовай выдачы прызоў з’яўляецца прад’яўленне ўдзельнікам, які выйграў прыз, пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першае паўгоддзе або першы квартал 2009 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка ўдзельніка Гульні ён павінен прад’явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першае паўгоддзе або першы квартал 2009 года.

20. Выдача прызоў (акрамя тэлевізараў, печы ЗВЧ і халадзільніка) ажыццяўляецца ў тэрмін да 20 сакавіка 2009 года ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

21. Дастаўка і ўручэнне тэлевізараў, печы ЗВЧ і халадзільніка ажыццяўляецца Арганізатарам Гульні ў тэрмін да 20 сакавіка 2009 года ўключна з паведамленнем аб канкрэтнай даце дастаўкі праз публікацыі ў сродках масавай інфармацыі.

Іншыя прызы могуць быць дастаўлены грамадзянам, якія іх выйгралі, па ўзгадненні з Арганізатарам і пры ўмове іх пражывання ў мясцовасці, блізка размешчанай ад мясцовасці пражывання грамадзян, якія выйгралі тэлевізар, печ ЗВЧ або халадзільнік.

22. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

23. Пасля 20 сакавіка 2009 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

24. Удзельнік Гульні, які выйграў прыз, нясе адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

25. Удзельнікі Гульні, якія выйгралі прызы, і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, пісьмы і інтэрв’ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв’ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

26. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», склад камісіі па яе правядзенні, памер і склад прызавога фонду да пачатку рэкламнай гульні апублікоўваюцца сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў сродках масавай інфармацыі.

27. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 18 студзеня 2009 года ўключна ў газеце «Звязда».

28. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 1223 ад 30.10.2008 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

1. ЗДАНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда»
2. ДОЎНАР Валянціна Аркадзьеўна, загадчык аддзела пісьмаў газеты «Звязда»
3. ЛЯЎКОВІЧ Таццяна Уладзіміраўна, вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»
4. ДАБРАВОЛЬСКІ Анатоль Васільевіч, вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»
5. ДЗЕВОЙНА Алена Уладзіміраўна, рэдактар юрыдычнага аддзела газеты «Звязда»

Тэрмін паўнамоцтваў Камісіі з 4 лістапада 2008 г. па 14 студзеня 2009 года.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПРЫЗ — РУПЛІВАМУ ПАШТАЛЬЁНУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Прыз — руплівому паштальёну» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з дадзенымі Правіламі ў тэрмін з 4 лістапада 2008 года па 12 лютага 2009 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда».

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), зарэгістраваная рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 02.08.2001 № 1010 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 100155376, УНП 100155376, месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

II. КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

3. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Прыз — руплівому паштальёну» (далей — Камісія) з тэрмінам паўнамоцтваў з 4 лістапада 2008 года па 12 лютага 2009 года ў складзе пяці чалавек.

4. Пасяджэнні Камісіі з’яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці з яе зарэгістраванага складу.

5. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з’яўляецца вырашальным.

6. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

III. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

7. Прызавы фонд Гульні фарміруецца за кошт чыстага прыбытку Арганізатара Гульні і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць	Цана за адзінку (руб.)	Кошт (руб.)	Стаўка ПДВ (%)	Сума ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Электрачайнік SCARLETT SC-1026 Ivory	4 шт.	59650	238600	18	42948	281548
2.	Электрачайнік SCARLETT SC-1029 Ivory Beige	3 шт.	54050	162150	18	29187	191337
3.	Пыласос SAMSUNG VCC 4023S3B/XEV	4 шт.	113700	454800	18	81864	536664
4.	Пыласос SAMSUNG VCC 4023S3B/XEV	3 шт.	93400	280200	18	50436	330636
5.	Гадзіннікі насценныя	7 шт.	24390	170730	18	30731	201461
6.	Халадзільнік МХ 2823-80 РБ, ЗАО “АТЛАНТ”	1 шт.	637100	637100	18	114678	751778

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Прыз — руплівому паштальёну» складае 2 293 424 (Два мільёны дзвесце дзевяноста тры тысячы чатырыста дваццаць чатыры) беларускія рублі.

IV. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ.

8. Удзельнікам Гульні можа быць любы паштальён РУП «Белпошта», які займаецца арганізацыяй падпіскі на газету «Звязда».

9. Удзельнік Гульні павінен падпісаць на газету «Звязда» максімальную колькасць падпісчыкаў на першае паўгоддзе 2009 года (але не менш чым на тры месяцы). Пры гэтым рост колькасці падпісчыкаў на газету «Звязда» ва ўдзельніка Гульні павінен складаць не менш як 7 чалавек у параўнанні з колькасцю падпісчыкаў на 01.07.2008 г.

10. Для правядзення розыгрышу і вызначэння пераможцаў кіраўнікі аддзяленняў сувязі і РУПСаў у тэрмін да 1 лютага 2009 года накіроўваюць у РУП «Белпошта» на імя старшыні Камісіі — намесніка генеральнага дырэктара па эксплуатацыі РУП «Белпошта» Саксонавай Ірыны Ігнацьеўны звесткі аб лепшых паштальёнах з пазнакай на канверце «Гульня «Прыз — руплівому паштальёну» па наступнай форме:

№ аддзялення сувязі
Адрас аддзялення сувязі
Прозвішча, імя, імя па бацьку паштальёна, адрас жыхарства
Колькасць падпісчыкаў, на якіх ім аформлены падпісныя абанементы на 01.07.2008 г.
Колькасць падпісчыкаў, на якіх ім аформлены падпісныя абанементы на 10.01.2009 г.
Рост падпіскі на газету “Звязда” за перыяд з 01.07.2008 г. па 10.01.2009 г. у экзэмплярах

Разам з звесткамі ў РУП «Белпошта» накіроўваюцца копіі дакументаў, якія пацвярджаюць колькасць падпісчыкаў, указаных у звестках.

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 9 лютага 2009 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. У пачатку розыгрышу прызоў звесткі аб лепшых паштальёнах сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску і сярод іх вызначаюцца паштальёны, якія адпавядаюць патрабаванням да ўдзельнікаў Гульні, выкладзеным у пункце 9 гэтых Правілаў.

Сярод апошніх спачатку вызначаецца адзін паштальён, які забяспечыў найбольшую ў рэспубліцы колькасць (але не менш як 80 чалавек) падпісчыкаў газеты «Звязда», а затым па тры лепшыя паштальёны ў кожнай вобласці і ў горадзе Мінску.

13. Паштальён, якога Камісія ў адпаведнасці з гэтымі Правіламі прызнае лепшым па рэспубліцы ў арганізацыі падпіскі на газету «Звязда» на першае паўгоддзе 2009 года, выйграе ў якасці прыза халадзільнік і ў розыгрышы іншых прызоў не ўдзельнічае.

14. Астатнія прызы размяркоўваюцца паміж лепшымі паштальёнамі ў кожнай вобласці і ў горадзе Мінску наступным чынам:

лепшыя паштальёны Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай абласцей выйграюць у якасці прыза па адным пыласосе SAMSUNG VCC 4023S3B/XEV коштам 113 700 рублёў;

лепшыя паштальёны Магілёўскай, Мінскай абласцей і горада Мінска выйграюць у якасці прыза па адным пыласосе SAMSUNG VCC 4023S3B/XEV коштам 93 400 рублёў;

паштальёны Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай абласцей, якія занялі другое месца ў сваім рэгіёне, выйграюць па адным электрачайніку SCARLETT SC-1026 Ivory коштам 59 560 рублёў;

паштальёны Магілёўскай, Мінскай абласцей і горада Мінска, якія занялі другое месца ў сваім рэгіёне, выйграюць па адным электрачайніку SCARLETT SC-1029 Ivory Beige коштам 54 050 рублёў;

паштальён, які заняў трэцяе месца ў сваім рэгіёне, выйграе насценны гадзіннік.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 20 лютага 2009 года ўключна ў газеце «Звязда».

16. Удзельнікам, якія выйгралі прыз, Арганізатар да 20 лютага 2009 года дасылае паведамленне аб гэтым заказным пісьмом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 9 лютага 2009 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. У пачатку розыгрышу прызоў звесткі аб лепшых паштальёнах сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску і сярод іх вызначаюцца паштальёны, якія адпавядаюць патрабаванням да ўдзельнікаў Гульні, выкладзеным у пункце 9 гэтых Правілаў.

Сярод апошніх спачатку вызначаецца адзін паштальён, які забяспечыў найбольшую ў рэспубліцы колькасць (але не менш як 80 чалавек) падпісчыкаў газеты «Звязда», а затым па тры лепшыя паштальёны ў кожнай вобласці і ў горадзе Мінску.

13. Паштальён, якога Камісія ў адпаведнасці з гэтымі Правіламі прызнае лепшым па рэспубліцы ў арганізацыі падпіскі на газету «Звязда» на першае паўгоддзе 2009 года, выйграе ў якасці прыза халадзільнік і ў розыгрышы іншых прызоў не ўдзельнічае.

14. Астатнія прызы размяркоўваюцца паміж лепшымі паштальёнамі ў кожнай вобласці і ў горадзе Мінску наступным чынам:

лепшыя паштальёны Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай абласцей выйграюць у якасці прыза па адным пыласосе SAMSUNG VCC 4023S3B/XEV коштам 113 700 рублёў;

лепшыя паштальёны Магілёўскай, Мінскай абласцей і горада Мінска выйграюць у якасці прыза па адным пыласосе SAMSUNG VCC 4023S3B/XEV коштам 93 400 рублёў;

паштальёны Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай абласцей, якія занялі другое месца ў сваім рэгіёне, выйграюць па адным электрачайніку SCARLETT SC-1026 Ivory коштам 59 560 рублёў;

паштальёны Магілёўскай, Мінскай абласцей і горада Мінска, якія занялі другое месца ў сваім рэгіёне, выйграюць па адным электрачайніку SCARLETT SC-1029 Ivory Beige коштам 54 050 рублёў;

паштальён, які заняў трэцяе месца ў сваім рэгіёне, выйграе насценны гадзіннік.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 20 лютага 2009 года ўключна ў газеце «Звязда».

16. Удзельнікам, якія выйгралі прыз, Арганізатар да 20 лютага 2009 года дасылае паведамленне аб гэтым заказным пісьмом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

17. Выдача прызоў ажыццяўляецца ў тэрмін да 30 сакавіка 2009 года ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

18. Умовай выдачы прызоў з’яўляецца прад’яўленне ўдзельнікам, які выйграў прыз, пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка ўдзельніка Гульні ён павінен прад’явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт або дакумент, які пацвярджае асобу.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 сакавіка 2009 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

22. Удзельнік Гульні, які выйграў прыз, нясе адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

23. Удзельнікі Гульні, якія выйгралі прызы, і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, пісьмы і інтэрв’ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв’ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

24. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Прыз — руплівому паштальёну», склад камісіі па яе правядзенні, памер і склад прызавага фонду да пачатку рэкламнай гульні апублікоўваюцца сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў сродках масавай інфармацыі.

25. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 1224 ад 30.10.2008 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПРЫЗ — РУПЛІВАМУ ПАШТАЛЬЁНУ»

Старшыня камісіі:
САКСОНАВА Ірына Ігнацьеўна, намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі РУП «Белпошта»

Члены камісіі:
1. ЗДАНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда»
2. ЛЯЎКОВІЧ Таццяна Уладзіміраўна, вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»
3. ДОЎНАР Валянціна Аркадзьеўна, загадчык аддзела пісьмаў газеты «Звязда»
4. ДЗЕВОЙНА Алена Уладзіміраўна, рэдактар юрыдычнага аддзела газеты «Звязда»

Тэрмін паўнамоцтваў Камісіі з 4 лістапада 2008 года па 12 лютага 2009 года

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства

Наименование предмета аукциона	**Право заключения договора аренды земельного участка для строительства логистического центра**
Арендодатель земельного участка	Барановичский городской исполнительный комитет, Брестская область, г. Барановичи, пл. Ленина, 2. Тел. 8(01634) 41 31 93
Адрес земельного участка/ Кадастровый номер земельного участка	Брестская область, г. Барановичи, ул. Вильчковского, д. 184з в промышленной зоне «Боровцы»/ № 141000000001002430
Размер (площадь) земельного участка, га	25,0
Срок аренды земельных участков, лет	50
Целевое назначение земельного участка	для строительства Логистического центра
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Участок свободен от строений. Участок примыкает к шоссе Р-2 Кобрин–Столбцы и железной дороге направлением Лида–Барановичи. 13,16 га – пахотные, 2,55 га – под древесно-кустарниковой растительностью, 1,56 га – под болотами низинными, 0,22 га – под водными объектами, 0,96 га – под дорогами, 6,55 га – прочие неиспользуемые земли. На земельном участке имеются ограничения в использовании земель на площади 1,47 га в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением 10кВ
Начальная цена предмета аукциона, руб.	507 452 659
Размер задатка, руб.	50 745 260
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории (при наличии)ы	внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка; возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; возмещения победителем аукциона потерь сельскохозяйственного производства в сумме 422 612,6 тыс. рублей путем перечисления средств на их возмещение на транзитный счет инспекции Управления государственного казначейства по месту регистрации победителя аукциона, код платежа для потерь сельскохозяйственного производства 05201; заключения победителем аукциона с горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления не позже чем в 2-месячный срок после принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; права вырубки древесно-кустарниковой растительности; осуществления строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; по истечения срока аренды земельного участка, совместно с Барановичским горисполкомом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования.
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11 тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by***

Аукцион состоится **12 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107 , УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельных участков на местности осуществляет арендодатель.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан: подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 4 ноября 2008 г. по 8 декабря 2008 года включительно.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 5 студзеня** ў рэдакцыю на адрас **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь», печ-ЗВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 студзеня 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 студзеня 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2009 г.** пры прад’яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў, печы-ЗВЧ і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэрмін правядзення гульні — з 04.11.08 па 14.01.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1223 ад 30.10.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на I кв. або 1-е паўг. 2009 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: (індэкс выдання) _____

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. / пераадрасоўкі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Тэлесеткі

Па сакрэту ўсяму свету

З учарашняга дня на Першым канале з'явілася новая штотыднёвая спартыўная праграма «Арэна», падрыхтаваная Агенцтвам тэлевізійных навінаў. Вядзе яе Вольга Барабаншчыкава.

Паводле ідэі стваральнікаў, канцэпцыя праграмы закладзеная ў самой назве. Арэна — гэта месца, дзе адбываюцца спаборніцтвы, дзе вырашаюцца лёсы і рушацца мары. А гледачу ўсё гэта бачна як на далоні. Тое, што застаецца «за кулісамі» — скандалы, інтрыгі і іншыя падзеі тэатра спартыўнага жыцця — фіксуюць камеры і карэспандэнты АТН ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, а таксама за межамі краіны. Свае прагнозы на бліжэйшыя спаборніцтвы будуць даваць вядомыя людзі — як спартсмены, так і прадстаўнікі мастацтва, бізнэсу і г.д.

Дарэчы, у праграме рэпарцёры абяцаюць не толькі паведамляць свежыя навіны, але і раскрываць некаторыя сакрэты: напрыклад, для чаго ў скачках у ваду спартсмены наведваюць джакузі ў перапынках, навошта змазваюць цела крэмам барцы перад выхадам на дыван, ці чаму ў тэнісе так часта мяняюць мячы...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Натуральны прырост сталіцы

Як паведаміў старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый Піневіч, за студзень—верасень у горадзе нарадзілася 15 588 дзяцей, што на 1033 больш, чым за аналагічны перыяд 2007-га. Узровень нараджальнасці ў горадзе склаў 11,5 праміле (колькасць нованароджаных на тысячу насельніцтва), у той час як у цэлым па краіне — 11,1 праміле.

За студзень—верасень гэтага года ў Мінску памерлі 13 041 чалавек, што на 153 больш, чым за такі ж перыяд 2007-га. Узровень смяротнасці склаў 9,6 праміле, што ніжэй больш чым на 40 працэнтаў, чым у цэлым па краіне.

У працаздольным узросце сёлета за дзевяць месяцаў памерлі 3603 чалавекі, што на 1,6 працэнта менш, чым год таму. Прычым смяротнасць сярод мужчын гэтай узроставай катэгорыі ў тры разы вышэйшая, чым сярод жанчын. Ва ўзросце, большым за працаздольны, памерлі 9936 мінчан.

БЕЛТА.

Дыялог ля тэлевізара

О, СПОРТ, ТЫ — ШОУ!

На беларускім тэлебачанні амаль адначасова фінішуюць два спартыўныя рэаліці-шоу — «Бітва гарадоў» на АНТ і «Цудоўная сямёрка» на «ЛАДзе». У бліжэйшыя некалькі тыдняў і там, і там вызначацца прэтэндэнты на перамогу. Але гэта і так убачаць усе ахвотныя, нам жа цікавей, што засталося па-за кадрам.

У праектаў абсалютна розныя бюджэты, таму параўноўваць іх у гэтым сэнсе — справа няўдзячная. Аднак, калі капнуць глыбей, пераконваешся, што для поспеху шоу важныя далёка не толькі яркія дэкарацыі, «зорныя» ўдзельнікі ды экстрым...

Агонь, вада і...

«Бітва гарадоў» — беларуская версія праекта «Вялікія гонкі», прыдуманага, між іншым, былым прэзідэнтам Францыі Шарлем дэ Голем. У Францыі гульня ідзе з 1962 года, а ўвогуле яна захапіла больш як 30 краін свету.

Удзельнікі шоу — 6 камандаў (па 12 чалавек у кожнай) з усіх абласцей Беларусі, прычым сярод гульцоў як людзі звычайныя, так і папулярныя асобы — спевакі, мадэлі, спартсмены, тэлевядучыя. На кану — прыз у 50 мільёнаў рублёў і права прадставіць Беларусь у міжнародным праекце. А на шляху да перамогі — як забаўныя касцюмаваныя конкурсы (зрэшты, забаўныя яны збоку, насамрэч кожны такі касцюм цяжкі, не заўжды зручны, і ў ім душна — але затое большменш бяспечна), так і даволі цяжкія, звязаныя з купаннем у халодным басейне або з «выхадам на быка». Быкі асаблівай пароды, не вельмі буйныя і не вельмі агрэсіўныя, але жвавыя — «разынка» ўсяго шоу, і ў першую чаргу з-за іх трэба вывозіць усе каманды ў Францыю. Бо застрахаваныя жывёлы на такую суму, што нават найбагацейшыя кітайскія тэлекампаніі не рызыкуюць везці іх да сябе...

На сёння ў гульні засталіся толькі тры каманды — з Брэста, Мінска і Віцебска.

«Цудоўная сямёрка» — гэта ўласна беларуская задумка ад пачатку да канца. Рэаліці-шоу складалася з сямі этапаў, у кожным з якіх непрафесіяналам — «зоркам» спорту, эстрады, тэлебачання — трэба было засвоіць і паказаць вынікі ў пэўным відзе спорту. Цяпер ідзе суперфінал, у якім у барацьбе сышліся пераможцы папярэдніх этапаў: спявачка Алеся (гарналыжны спорт, слалам), Вольга Барабаншчыкава (водныя лыжы), Аляксей Хлястоў (конны спорт), спявачка Алена Ланская (біятлон), 5-разовы чэмпіён свету па біятлоне Вадзім Сашурын (скалалазанне), майстар спорту па кікбоксінгу Карына Аляксандрава (картынг). Замест пераможцы эпізоду «Сінхроннае плаванне» Алены Бікрэневай, якая нядаўна стала мамай, выступае спявак Тарыел Майсурадзе. Кожны пераможца эпізоду атрымаў прыз — ноўтбук, але напярэдзе яшчэ галоўны прыз — аўтамабіль Shevrole Niva. А дзеля таго, каб яго атрымаць, давядзецца прайсці агонь і ваду — у літаральным сэнсе! Прычым загадзя пра гэта ўдзельнікі не здагадваліся, ім выдалі толькі спіс неабходных рэчаў, сярод якіх — спартыўная форма і канцэртны касцюм, сталовыя прыборы і вудачкі, цёплыя рэчы і 2—3 фанаграмы... «Для ўдзельнікаў была легенда, што сцэнарый праекта робім не мы, а старонніе людзі, — расказвае рэжысёр праекта Анатоль Вечар, — хоць насамрэч выпрабаванні падбірала наша здымачная група. Але рэалізаваць удалося не ўсе іх — напрыклад, у апошні момант вырашылі не рызыкаваць жыццямі ўдзельнікаў, сярод якіх некаторыя адмовіліся скочыць з парашутам». Затое веласіпедныя гонкі па бездарожжы, начоўку ў лесе, «канцэрт у палявых умовах» і іншыя прыемнасці жыцця арганізатары «зоркам» забяспечылі.

Мала кашы елі!

Не раз даводзілася чуць ад гледачоў пра конкурсы ў абодвух шоу — маўляў, нічога цяжкага ў іх няма, зрабіць нескладана, трэба было проста падрыхтавацца як след і больш кашы з'есці... Як насамрэч складаліся справы і з кашай, і з падрыхтоўкай, мы дазналіся непасрэдна ад арганізатараў.

Прадзюсар шоу «Бітва гарадоў» Сяргей Хоміч расказаў, што ў Францыі ўсіх удзельнікаў засялілі ў звычайны турыстычны комплекс па 2—4 чалавекі ў пакоі, кармілі таксама звычайнай «сталоўскай» ежай — ніякіх далікатэсаў, але ўсё дастаткова сытна, большасці хапала. Толькі два атлеты-цяжкавагавікі, волаты Кірыл Шымко і Павел Сарока, баяліся... пахудзець. Таму бралі ў сталоўцы па некалькі порцый, а па начах нават нелегальна варылі макарону ці «лёгкі перакус» — некалькі дзясяткаў яек.

Што да падрыхтоўкі, то каманды — а ў іх набіралі па кастынгу, улічваючы фізічную форму — пачалі трэніравацца за месяц да здымак, наведвалі фітнэс-клубы, басейны, нават у вайсковых часцях бег з перашкодамі арганізоўвалі.

У «Цудоўнай сямёрцы», паколькі спаборніцтва не каманднае, і кожны сам за сябе, зоркам давялося добра-такі папацець. Натуральна, усе яны рэгулярна займаюцца ў фітнэс-клубах, а спартсмены дык і ўвогуле загартаваныя пастаяннымі трэніроўкамі — але дапамагло гэта далёка не ўсім. Скажам, у эпізодзе «Біятлон» стаўка трэнераў на гімнастку Жэню Паўліну не апраўдалася. І наадварот — на скаладроме спявачка Алеся доўга скардзілася, што нічога ў яе не атрымаецца — а ў выніку ўзяла вышыню з такой хуткасцю, ледзьве не нарматыў кандыдата ў майстры спорту выканала. Вось што з людзьмі адрэналін робіць.

З харчаваннем у шоу здарылася асобная цікавая гісторыя. Удзельнікі ўзялі з сабой вудачкі — адпаведна, атрымалася налавіць рыбы. Дадаткова ім выдалі грошы — улічваючы беларускія рэаліі, усяго па 10 000 рублёў на чалавека, і адправілі некалькіх дзяўчат за 5 км у магазін — набыць хлеб, соль, перац ды крупу, каб з чымсьці тую рыбу з'есці. Дзяўчаты прынеслі... бутэльку гарэлкі, пачак грэчкі і бутэльку мінералкі — каб зварыць крупу. Але, як жартуюць «ЛАДаўцы», дзяўчаты былі бландзінкамі, таму і мінералка аказалася газаванай. Словам, паесці грэчкі не ўдалося — здымачная група прывезла яе назад у Мінск. Добра хоць, мясцовыя жыхары падзяліліся перцам і соллю, таму ўдалося запячы рыбу на рашотцы. «Непрыемную місію пачысціць рыбу ніхто не хацеў на сябе браць, — узгадвае рэжысёр, — пакуль не ўзяўся Лёша Хлястоў. У выніку яго ж потым і абвінавацілі, маўляў, закахаўся — таму што рыба аказалася перасоленай».

А няшчасныя выпадкі ў вас на будоўлі былі?

«Паводле міжнароднай статыстыкі, — паведамілі на АНТ, — у «Вялікіх гонках» за сезон бываюць 1—2 расцяжэнні і 1—2 пераломы». Аб гэтым усіх удзельнікаў шчыра папярэдзілі. І кожны падпісаў паперу, што не мае супрацьпаказанняў па здароўі, а ў выпадку траўмаў не выставіць прэтэнзій да арганізатараў. Праўда, страхоўкі ўсё адно даваліся афармляць — для аказання медыцынскай дапамогі непасрэдна ў Францыі. Бо практычна пасля кожнага шоу, расказвае Сяргей Хоміч, даводзілася адпраўляць людзей у бальніцу. «Але калі б гэтыя конкурсы не былі дастаткова жорсткімі, то і гульня не была б такой папулярнай», — лічыць прадзюсар. Нагадаем, сур'ёзныя траўмы сярод беларусаў атрымалі два гульцы — спявачка Ірына Дарафеева і ўдзельнік каманды Брэста.

Ступень рызыкі ў «Цудоўнай сямёрцы» пастаянна кантралявалі прафесіяналы-інструктары — мабыць таму ні пераломаў, ні разбітых чэрапаў падчас здымак не было. Але дробныя непрыемнасці ўсё адно здараліся — у Бабруйску атрымалі глыбокія драпіны Алеся і Аляксей Хлястоў, давялося шукаць паравязачныя матэрыялы, а пазней падчас «вогненнага» выпрабавання ў таго ж Хлястова, кажуць, абгарэлі вейкі і бровы.

— У двух эпізодах праекта ўдзельнічала ваша жонка, Аксана. Не было страшна за гэтым сачыць? — пытаюся ў Анатоля Вечара.

— Калі яна ўпала з каня і я бачу, што чалавек устае і яўна губляе арыентацыю, што адбываецца — вядома ж, было страшна, мы потым паўдня яе па бальніцах вазілі, — пагаджаецца рэжысёр. — А ў біятлоне, хутчэй, было крыўдна — страляла Аксана адменна, 9 з 10, але заняла толькі пятае месца. У яе было дзве спробы выйграць прамежкавы прыз — ноўтбук, але абодва разы не атрымалася. Давялося ў выніку падарыць ёй ноўтбук на дзень нараджэння! *(Смяецца.)*

«Палескіх рабінзонаў» у дзяцінстве чыталі? Там усё таксама бяскрыўдна пачыналася...

«Зоркі» як людзі

У што, гледзячы спартыўныя рэаліці-шоу, цяжка паверыць, тык гэта ў тое, што падчас працяглых здымак і цяжкіх спаборніцтваў ніхто з «зорных» персанажаў не капрызнічаў. Зрэшты, у Францыі ў іх проста не было на гэта часу — з дзвюх гадзін дня да трох гадзін ночы ўсе былі занятыя на асноўных здымках, прычым за спазненне на пляцоўку меркаваўся такі штраф, што ніхто не рызыкнуў спазніцца, а з раніцы вяла свае здымкі група АНТ. «Спачатку па прыездзе на ўсіх уздзейнічала магія: Францыя, Лазурнае ўзбярэжжа, мора... Але пры нашым графіку ні на шопінг, ні на купанне ці іншыя радасці часу не заставалася, — сцвярджае Сяргей Хоміч. — І ніхто не супярэчыў — усе былі ў аднолькавых умовах, ведалі, на што ішлі». Непасрэдна ж на пляцоўцы французскія арбітры таксама не рабілі нікому паблажак — выскачыў, скажам, Мікалай Мірны заступіцца за сваю каманду, яго, нягледзячы на аўтарытэт, выдалілі з арэны.

Іншая справа — калі здымкі ідуць у роднай краіне, дзе няма праблем з мовай, валютай і да цябе зусім іншае стаўленне. Таму ў «Цудоўнай сямёрцы» час ад часу «ўключалі зорку» практычна ўсе ўдзельнікі, нават любімы здымачны групай Вадзім Сашурын пару разоў штосьці буркатаў незадаволена... Але дарэмна «зоркі» гэта рабілі — усё ж будзе ў кадры! Нават тыя цікавыя эпізоды, што не ўвайшлі ў асноўны час праекта. З іх вырашана зрабіць асобны выпуск і паказаць, каб паказытаць усім нервы, бліжэй да ўзнагароджання пераможцаў. Апошніх, дарэчы, будзе тры: першы вызначыцца па агульнай суме балаў, другога назавуць прадстаўнікі СМІ, трэцяга выберуць тэлегледачы. А галоўнага прызёра з ліку гэтых трох будуць выбіраць удзельнікі ўсіх папярэдніх эпізодаў «Цудоўнай сямёркі».

* * *

Што маем у выніку? Два розныя і ў той жа час падобныя спартыўныя шоу, кожнае з якіх ёсць за што ўхваліць і за што пакрытыкаваць. Што цікавейшае — экзотыка ці беларуская рэчаіснасць, міжнародны статус ці непаўторнасць ідэі, антураж ці змест? Рашэнне, як заўжды, за гледачом.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прадастаўлена тэлеканаламі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.16	16.29	9.13
Віцебск —	7.10	16.14	9.04
Магілёў —	7.06	16.19	9.13
Гомель —	6.58	16.21	9.23
Гродна —	7.31	16.45	9.14
Брэст —	7.27	16.51	9.24

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *ІКОНЫ КАЗАНСКАЙ БОЖАЙ МАЦІ (восеньскай), Ганны, Лізаветы, Аляксандра, Антона.*
К. *Яны, Альгерда, Віталя, Кароля.*



Дзве даты

4 лістапада

1816 год — нарадзіўся Арцём Ігнатавіч Вярыга-Дарэўскі. Яго творы з-за цэнзурных праследаванняў не друкаваліся, апублікаваны толькі «Плач салдаткі». У 1858—63 гадах вёў «Альбом» — унікальны помнік беларускай культуры. Першым пераклаў на беларускую мову «Конрада Валенрода» Адама Міцкевіча. За ўдзел у паўстанні 1863—64 гадоў сасланы ў Сібір, дзе памёр у 1884 годзе.

1848 год — адкрыта першае ў свеце метро. Ідэю пабудаваць падземную чыгунку для хуткай транспарціроўкі грамадзян з аднаго канца Лондана ў другі падаў адвакат Чарльз Пірсан. Першая лінія метро працягласцю 6 кіламетраў звязвала лонданскія вакзалы Пэдзінгтан і Фарынгтан і называлася Metropolitan Railway, г.зн. «сталічная чыгунка». Скарачэнне гэтай назвы да пяці першых літар і дало ўсім нам знаёмае «метро».

Цытата дня:

«Калі ж чытаць, і чытаць без канца, не абдумваючы затым прачытанага, то яно не пускае карэнні і па большай частцы гіне».

Артур Шапенгаўэр (1788—1860), нямецкі філосаф.

АБЯРЭГІ Ў ДАРОЗЕ

Каб у дарозе абараніць сябе, сваіх блізкіх, свойскую жывёлу, у народзе існавала вялікая колькасць магічных дзеянняў, замоў і абярэгаў.

■ Так, перад тым, як адправіць вясельны поезд у дарогу, бацькі нявесты абавязкова выконвалі вельмі важнае рытуальнае дзеянне — картэж абыходзілі тройчы па крузе па сонцы і абсыпалі зернем жыта — тым самым «замыкалі» прастору вакол яго. Атрымлівалася, што вясельны картэж з'яўляўся своеасаблівым фрагментам хатняй, засвоенай і абароненай прасторы.

■ Часцей за ўсё абярэгамі на вяселлі ці ў час хрэсьбіннага абраду выступалі чацвярговая соль і хлеб, жыта, свянцоная вада: «У якую б дарогу ні ішоў чалавек, трэба браць з сабой акраец хлеба і дроб солі, то не трапяцца шкодныя прыгоды».

■ Надзейным абярэгам у дарозе лічыўся мак, асвечаны на Спаса-Макавея.

■ Калі нехта накіроўваўся ў далёкі шлях, ён звяртаўся па падтрымку сакральнага месца ў хаце — стала: тройчы цалаваў яго. Стол цалавалі і тады, калі вырталіся дадому. Перад тым, як адправіць маладых у храм, бацька нявесты тройчы абводзіў іх вакол стала.

■ Дарога ў сімвалічным плане падзяляла прастору на дзве паловы: правая была для людзей і Боскага пачатку, левая — для звяроў і іншага свету. Таму, каб перасцерагчы сябе пры сустрэчы з людзьмі ці жывёламі, неабходна было перайсці на правы бок і сказаць: «Я іду сваёй дарогай, а ты — сваёй».

■ Калі ішлі ў далёкую дарогу, з сабой бралі жменю роднай зямлі, якая будзе зберагаць і дапамагаць у складаных сітуацыях. Пры гэтым казалі так: «Родны дом, родная зямля, зберажы і абарані (імя) у шляхах-дарогах».

■ Арэх-спарыш заўсёды лічыўся надзейным ахоўнікам у далёкай дарозе.

■ Абярэгам у дарозе лічылася і адзенне, якое апраналі на левы бок.

■ У час вяселля перад маладымі падмяталі дарогу, а венік закідвалі далёка ад хаты. Лічылася, што калі на дарозе былі закапаныя рэчы на разлучэнне маладых, венік «возьме» на сябе гэту інфармацыю.

■ У дарогу бралі так званыя падарожныя абразы. Сярод іх абраз Боскай Маці, пад назвай «Споручница грешных»; Смаленскі абраз «Адзігітрыя», а таксама абразы з выявамі святых угоднікаў: прападобнага Антонія Рымляніна, Наўгародскага цудатворцы; прападобных Зосіма і Савація Салавецкіх, пакутніцы Кацярыны.

■ Важнымі складнікамі рытуалаў-абярэгаў былі малітвы і замовы. Калі ісці ў дарогу паводле прынцыпу «сцеражонага Бог сцеражэ», то хутчэй за ўсё вам будзе спрыяць толькі поспех.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Знакавае месца

У САМЫМ ЦЭНТРЫ МОДЫ

З 37 дамоў мадэляў, якія існавалі на постсавецкай прасторы, да цяперашняга часу дажыў толькі адзін — Беларускі Цэнтр Моды, якому 5 лістапада спаўняецца 60 гадоў.

Свой прыгожы юбілей Беларускі Цэнтр Моды адзначыць правядзеннем Тыдня моды Беларусі, у межах якога адбудзецца спецыяльны семінар для спецыялістаў модней індустрыі па накірунку моды «Вясна—лета-2009», фестываль модаў «Лён-2008» і эксклюзіўныя паказы аўтарскіх калекцый дызайнераў Цэнтра Моды Эльвіры Жвікавай, Марыі Ніцэвіч і Настассі Броўкі. І зусім не важна, што гэты самы тыдзень зноў абмяжуецца літаральна трыма днямі. Галоўнае, у Беларусі ёсць падобныя «тыдні» і на іх ёсць што паказваць. Больш за тое, створанае беларускімі дызайнерамі адзенне могуць насіць не адны толькі мадэлі. Альтэрнатыва «кітайшчынцы» — вось яна, прадаецца ў фірменных секцыях Цэнтра Моды, як непасрэдна пры самім цэнтры, так і ў некаторых буйных гандлёвых пунктах абласных гарадоў і Мінска, у тым ліку ў гандлёвым цэнтры «Сталіца».

Зараз ААТ «Цэнтр Моды» — гэта адзін з лепшых у рэспубліцы вытворцаў якаснага сучаснага адзення, інстытут моды, інфармацыйны цэнтр для прафесійнай аўдыторыі. Гэта вядучая арганізацыя, якая распрацоўвае прамысловыя і прэзентацыйныя калекцыі пад заказ, стварае імідж і фірменны стыль, распрацоўвае і вырабляе форменнае і прадстаўнічае адзенне.

Дырэктар ААТ «Цэнтр Моды» Любоў Манулік кажа, што цэнтр працуе для ўсіх, для каго мода, адзенне напоўненыя знакавым сэнсам. І адзначае, што такіх людзей становіцца ўсё больш.

— Шэсць брэндаў, шэсць ліній дапамагаюць модна апранацца любой жанчыне, — тлумачыць Любоў Васільеўна. — Лінія «Шык» — гэта вытанчанае, вячэрняе адзенне, якое ў рэспубліцы фактычна ніхто больш не вырабляе. «Лэдзі-бос» — недарагая лінія для жанчын з сярэднім дастаткам, для работы ў офісе, для адпачынку плюс верхняе адзенне. «Лэдзі плюс» — модныя і стыльныя вырабы для дам з формамі. «Люкс» — гэта добрыя, натуральныя матэрыялы. «Галерэя лёну» — брэнд, які пастаянна развіваецца, яго палюбілі ў нас і ён добра экспартуецца. Нарэшце, «Подыум» — аўтарскія калекцыі. Па ўсіх пазіцыях адзначаецца запатрабаванасць і попыт на гатовы прадукт...

— Наша задача падчас тых жа Тыдняў моды Беларусі — не проста прадэманстраваць творчы патэнцыял, а спрыяць таму, каб на ўнутраным рынку вырабляць модны, стыльны, «смачны» прадукт, — заўважае галоўны мастацкі кіраўнік Цэнтра Моды Эльвіра Жвікава. — Усе калекцыі павінны знаходзіць пакупніка. Дызайнер не мае права ствараць «нятленку ў шафу»...

Дызайнеры цэнтра былі неаднаразовымі ўдзельнікамі і прызёрамі міжнародных фестываляў і конкурсаў. Аўтарскія калекцыі дэманстраваліся ў Японіі, Кітаі, Індыі, Польшчы, Румыніі, Югаславіі, Канадзе, Германіі, Італіі, Францыі. Цяпер цэнтр цесным чынам супрацоўнічае з адной вядомай французскай маркай — шые пад заказ на замежны рынак. Гэта адначасова спрыяе актыўнаму навучанню нашых спецыялістаў сучасным аспектам стварэння моднага адзення. Дарэчы, будучыя калекцыі сваіх дызайнераў Цэнтр Моды будзе суправаджаць не толькі «лэйблам» самога цэнтра, але і імем стваральніка мадэлі — на замежны лад.

І правільна. Будзем пераймаць у замежнікаў лепшае, але пры гэтым ствараць і насіць сваё. І за «вялікімі» дызайнерамі свету, якія бяруць за свае візіты шалёныя ганарары, таксама ганяцца не будзем... Навошта? Пабывалі на Беларусі калісьці П'ер Кардэн і Тэд Лапідус, і хопіць. У нас жа ёсць свае, магчыма, не з такімі гучнымі імёнамі, але з залатымі рукамі і зразумелай нам фантазіяй. Колькі можна «прысядаць» перад іншаземным?

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Пятра ФАМІНА.

Абразок

ЛІПА

Алесь Шаўцоў

Удрэў, як і ў людзей, у кожнага — свой лёс. Адно ледзь праб'ецца на свет, а яго ўжо стопчуць, ці зааруць. Мусіць, яму здарылася вырасці не ў тым месцы ці не ў той час. Другое дрэва, і такіх большасць, расце сабе паволі ў лесе паміж такіх самых дрэў. Калі ўсе квітнеюць, дык і яно квітнее, калі ўсе вясной зелянеюць ці ўвосень скідваюць лісце, дык і яно робіць тое ж самае. А калі надыдзе пэўны час, тое дрэва разам з іншымі пераўтворыцца ў дровы, а калі пашанцуе, то — у шафу ці зэдлік. Але ёсць дрэвы, якія воляй выпадку ці па пяшчоце годнага чалавека растуць даўжэй за астатнія, робяцца вышэйшымі і мацнейшымі за іншых, а пасля скону веку людская памяць пра іх жыве яшчэ доўгія гады.

Такое дрэва расло і ў адным з ціхіх мінскіх двароў. Гэта была ліпа. Старая, вялізная, з дзвюма верхавінамі, яна панавала над дваром і бараніла яго ад вятроў са Свіслачы, якая цячэ побач. Штогод у месяцы, які так і называецца — ліпень, ліпа цвіла, яе мядовы водар быў чутны здалёк, пчолы ў яе галінах гулі, як моцны трансфарматар на падстанцыі. Жанчыны з навакольных дамоў прыходзілі пад ліпу з пакецікамі і бралі ліпавы цвет, чый адвар разам з малінавым варэннем былі раней першай дапамогай ад зімовых хваробаў.

Праз вулачку раслі, мабыць, адзіныя на той час ва ўсім Мінску пірамідальная таполя і сібірская лістоўніца. Іх і паасобку не часта ўбачыш, а тут — разам. Кажуць, жыў тут яшчэ за царскім часам бацюшка, які па сваёй місіянерскай справе пабываў у розных краінах. На ўспамін пра іх ён і пасадзіў тыя дрэвы. Калі ўвечары прамяні сонца на захадзе прабіваліся праз галлё спачатку высокай, як мінарэт, таполі, а потым лістоўніцы, якая нібыта сышла з японскай мініяцюры па шоўку, людзі выходзілі ў двор, садзіліся пад ліпай на лаўкі і ціха размаўлялі пра свае справы.

Вулачка, на якой стаяць нашы дамы, на карце Мінска з'явілася даволі даўно і, што цікава, за ўвесь час існавання сваёй назвы не мяняла. Свой пачатак яна бярэ ад насыпу былой Лібава-Ровенскай чыгункі, якая была пабудавана ў 1873 годзе. Вулачка на Хаванскай горцы (яе назва — ад прозвішча гаспадара пляца, што жыў на рагу) перасякае былы Ігуменскі тракт, які ўжо ў савецкі час перайменавалі спачатку ў Чэрвеньскі тракт, а потым у вуліцу Маякоўскага. Дарэчы, ад скрыжавання з нашай вулачкай Ігуменскі тракт раней мяняў назву на Дачны праспект — ён вёў да вядомага маёнтка Прушынскіх-Любанскіх у Лошыцы.

Паралельна нашай вулачцы цячэ безыменны ручай, які неўзабаве ўпадае ў Свіслач. Мо і было калі ў ручая сваё імя, але мне яно, на жаль, невядома. На месцы ручая цяпер знаходзіцца школьны стадыён, а ручай цячэ ў трубе. У свой час праз ручай была зроблена кладка, па якой мы хадзілі ў школу.

Школа наша мела пятнаццаты парадкавы нумар, зразумела, што першыя вучні займаліся тут яшчэ да вайны. Калі ў сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя наш выпускны клас ладзіў традыцыйны сход, то мы развесілі на слупах запрашэнні па ўсім наваколлі і — не прагадалі. Прыйшло шмат былых вучняў і нават некалькі бабулек-выпускніц 30-х гадоў. На наша пытанне, а дзе ж астатнія, адказ быў вельмі просты — загінулі ў вайну.



У час маіх школьных гадоў на берагах ручая мы з хлопцамі знаходзілі стрэляныя гільзы, а аднойчы трапілі нават на цэлыя патроны. Калі пра гэта дазналіся дарослыя, то на ручай прыехалі сапёры і зрабілі, як цяпер кажуць, «зачыстку». Нашы бацькі тое ж самае зрабілі з нашымі мяккімі месцамі.

Вайна пакінула на нашай вулачцы і сумныя ўспаміны. Трохі старэйшыя за нас хлопцы неяк пасля школьных заняткаў адкапалі зямлянку, дзе знайшлі чалавечыя косткі. Выклікалі міліцыю, вайскоўцаў, тыя апыталі жыхароў, хто памятаў ваенны час. Высветлілася, што знойдзеныя рэшткі належаць чатыром чырвонаармейцам, якія летам 1941 года ў першыя гадзіны акупацыі Мінска наладзілі засаду на Чэрвеньскім тракце, чым нарабілі немцам шмат шкоды, але, на жаль, і самі загінулі. Мясцовыя жыхары ўначы пад страхам смерці таемна пахавалі салдат пад вялікай бярозай. Зразумела, што ніякіх помнікаў ці крыжоў на магіле ў той час пастаўлена не было. Цяпер прах герояў-абаронцаў пакоіцца на Чыжоўскіх могілках, дзе яны былі ўрачыста, з ваеннымі ўшанаваннямі, пахаваныя наноў.

На нашай вулачцы да канца 50-х гадоў стаяла невялікая вайсковая часць. Ад яе засталася алея старых таполяў, двухпавярховы будынак былога штаба і дом, дзе жылі сем'і афіцэраў. Пасля расфарміравання часці на месцы драўляных казармаў вайскоўцамі былі пабудаваныя два чатырохпавярховыя жылыя дамы, у якія з усёй краіны з'ехаліся памежнікі. Гэта было ў час так званага «хрушчоўскага дэмбеля», калі адбывалася масавае скарачэнне ўзброеных сілаў. Амаль усе, хто жыў тут, ведалі адзін аднаго яшчэ па сумеснай службе па ахове межаў, шмат хто сябраваў сем'ямі. Штогод адстаўнікі талакой выходзілі на суботнікі, ладзілі свята двара, у дамах і навокал быў узорны парадак, раслі дрэвы, цвілі кветкі.

Далей наша вулачка ішла покатам да рэчкі, міма прыватных сядзібаў, і праходзіла па-над млынам. Трохпавярховы млын да вайны і нейкі час пасля яе карыстаў моц Свіслачы, для чаго тут была зроблена драўляная плаціна і вадаскід. Калі ў 50-х гадах будавалі ЦЭЦ-2, то ніжэй за млын па рацэ паставілі новую плаціну, ужо капітальную, якая цяпер трымае воду на адным узроўні круглы год. Млын быў спачатку пераведзены на электрычнае сілкаванне, а потым і зусім зруйнаваны. Яго голыя цагляныя сцены без даху і з пустымі вокнамі амаль дваццаць гадоў узвышаліся на беразе. Побач стаялі драўляныя пакгаўзы, якія мелі вароты ў два бакі — на вуліцу і на рэчку. Справа ў тым, што раней прывозілі збожжа і забіралі гатовую муку не толькі на калёсах і машынах, але і па вадзе на лодках. На мастках было вельмі зручна сядзець летам з вудай, а зімой чапляць на валёнкі канькі, каб гойсаць па пакрытай ільдом Свіслачы. Нашчадкі галубоў з млына да гэтага часу жывуць пад дахамі дамоў нашай вулачкі. Да млына вёў таксама невялічкі завулак, які так і называўся — Млынарны, ён існуе і цяпер.

Далей за млын вулачка блукае ўздоўж ракі, акрэсліваючы старажытную вёсачку — Сакалянку. Тут захаваўся маленькі куток аднапавярховага старога, амаль вясковага ўкладу з садавінай ды гароднінай, сабакамі ды курамі.

Яшчэ не стаіць на месцы, змены кранулі і нашу вулачку. Замест крывабокіх хацін выраслі шматпавярховыя жылыя дамы, на месцы дашчаных баракаў стаіць будынак раённай адміністрацыі, бераг рэчкі добраўпарадкаваны, адсыпаны сцежкі, пастаўлены лаўкі, панатыканы маладыя дубчыкі. Там штодня з раніцы да вечара можна сустрэць людзей усіх узростаў: падлеткаў і маладых жанчын з вазкамі, пенсіянераў і бегуноў. На беразе пасуцца качкі, якіх ніхто не пужае, наадварот, іх кормяць хлебам.

Але няма ўжо ні ліпы, ні таполі, ні лістоўніцы. Іх спілавалі з мэтай менавіта добраўпарадкавання. Пайшлі з жыцця ахоўнікі межаў некалі вялікай краіны, іх дзеці і ўнукі раз'ехаліся. На месцы былой салдацкай магілы — роўны газон. Шкада, калі чалавечая памяць губляе гісторыю, але яшчэ больш шкада, што мала каму сёння гэта патрэбна. Спадзяюся, што калі нашы людзі большменш уладкуюць свае справы і задаволяць фізічныя патрэбы, яны звернуць сваю ўвагу на духоўныя бакі жыцця, у тым ліку і на гістарычныя карані. Тады і добраўпарадкаванне будзе рабіцца з большым сэнсам, не губляючы повязі часоў, і як для сябе. Каб толькі засталіся на той час людзі, якія будуць здольныя адказаць на слушнае пытанне — а што тут было раней?

Ну а назва нашай вулачкі вельмі простая, як само жыццё — Палявая.

Усміхнёмся!

Дзве сяброўкі.

— Вой, ведаеш, так хачу з'ездзіць сёлета ў Сочы...

— Мілая, ведаеш, у колькі гэта табе можа абысціся?

— Так, ведаю. Гадзіны тры давядзецца праплакаць.

☺

— Я сібірскай язвы не баюся, у мяне імунітэт.

— Што, перахварэў ужо?

— Ды не, у мяне жонка з Сібіры.

☺

Калі мужчына — глава сям'і, значыць, ён амаль напэўна халасцяк.

☺

— Чуеш, ты! Ідзі сюды! Біць буду!

— Малады чалавек! Не інтрыгуйце мяне сваімі кваццістымі метафарамі! Я вышэй за вашы ганебнасці!

— Ой, прабачце велікадушна — вяртаюся з філармоніі, позні вечар, вырашыў перастрахавацца... Хадземце, я вас праводжу!

☺

Танцы «пад Верку Сярдзючку» — больш бясспрэчны доказ паходжання чалавека ад малпы, чым тэорыя Дарвіна.

☺

— Піць будзеш?

— Не.

— А калі я збегаю?

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ